Дзяржаўны літаратурны

Музей Янкі Купалы



Да 75-годдзя
Дзяржаўнага літаратурнага
музея Янкі Купалы

ДЗЯРЖАЎНЫ ЛІТАРАТУРНЫ МУЗЕЙ ЯНКІ КУПАЛЫ

Альбом-каталог

З мастацкай калекцыі
Дзяржаўнага літаратурнага музея Янкі Купалы

МІНСК
«БЕЛАРУСЬ»
2019

# Я адплаціў народу, чым моц мая магла...

Янка Купала

YANKA KUPALA:
I REPAID THE PEOPLE WITH WHAT MY VIRTUE COULD…

УДК
ББК
Я

Рэцэнзенты:
доктар мастацтвазнаўства, прафесар В. І. Жук,
доктар мастацтвазнаўства, прафесар Р. Ф. Шаура

Фота:
А. Дрыбас, Д. Ласько, Б. Лазука

*Выпуск выдання ажыццёўлены па заказе і пры фінансавай падтрымцы Міністэрства інфармацыі Рэспублікі Беларусь*

**Ла, Б. А.**

Я У засені замкаў і палацаў : матэрыяльная культура сацыяльнай эліты Беларусі XII — пачатку XX стагоддзя / Б. А. Лазука.— Мінск : Беларусь, 2018.— 319 с.

ISBN 978-985-01-1218-7.

В

Адрасавана шырокаму колу чытачоў.

**УДК**
**ББК**

**ISBN 978-985-01-1300-9**

© 2019
© Афармленне. РУП «Выдавецтва «Беларусь», 2019



У кожнага народа ёсць паэты — пракрокі, якія сілай свайго таленту вызначаюць не толькі шляхі развіцця роднай мовы, літаратуры, культуры, але і акрэсліваюць нацыянальную ідэнтычнасць, даючы духоўныя арыенціры не аднаму пакаленню. Яны прыносяць славу і пашану свайму народу і з цягам часу становяцца яго сімваламі. Найважнейшым для беларусаў стала імя Янкі Купалы.

Яркая зорка паэтычнага таленту Янкі Купалы ўзышла ў час адраджэння беларусаў як еўрапейскай нацыі, у бурную эпоху войн і рэвалюцый, калі Беларусь рабіла першыя крокі да ўласнай дзяржаўнасці. Ролю беларускага Песняра ў станаўленні беларускай нацыі, мовы і дзяржаўнасці цяжка пераацаніць.

Унёсак Янкі Купалы ў развіццё роднай літаратуры настолькі важкі і каштоўны, што ўзровень, паказаны ім, дасягальны далёка не для кожнага творцы. Іван Дамінікавіч далучыў беларускую культуру да сусветнай: дзякуючы яго творчасці нас ведаюць у многіх краінах. Яго творы перакладзены на многія мовы. Адзін толькі верш «А хто там ідзе?» сёння гучыць на 100 мовах народаў свету.

Беларусь захоўвае ўдзячную памяць пра свайго Песняра і Прарока. І дадзенае выданне — яшчэ адзін каменьчык у падмурак ушанавання памяці паэта.

Уладзімір Караткевіч сказаў пра Янку Купалу: «Гэты чалавек усім створаным вярнуў народу годнасць, годнасць за сваё мінулае, сілу жыць у сённяшнім, мужнасць, каб глядзець у будучыню… для нас, беларусаў, ён адзін такі. Ён — Купала. І гэтым усё сказана».

Алена Ляшковіч,
дырэктар Дзяржаўнага літаратурнага
музея Янкі Купалы,
кіраўнік праекта

Альбом-каталог мастацкай калекцыі музея Янкі Купалы з'явіўся ў момант, калі ён вельмі патрэбны. Няма сумневу, што калекцыя, якая няспынна расце і папаўняецца, каштоўная сама па сабе, нават не ў звязку з музеем, а як самая вялікая ў свеце, прысвечаная класіку беларускай літаратуры і аднаму са стваральнікаў беларускай ідэі, «архітэктару» беларускай нацыянальнай самасвядомасці. Аднак калі разглядаць мастацкую калекцыю ў сістэме музея, як інструмент сучаснай музейнай камунікацыі, яе каштоўнасць і эфектыўнасць узмацняюцца шматкроць, аб чым сведчыць незвычайная папулярнасць музея Янкі Купалы, аднаго з самых паспяховых музеяў сталіцы і краіны.

Калекцыя дазваляе ўсебакова і разнастайна праілюстраваць, пракаментаваць і прадставіць у кантэксце часу галоўнага героя — паэта, драматурга, перакладчыка, культурнага і грамадскага дзеяча Янку Купалу (Івана Дамінікавіча Луцэвіча, 1982—1942). Перш за ўсё калекцыя адлюстроўвае варыянты інтэрпрэтацый вобраза Купалы, яго ўспрыманне ў розныя часы і гістарычныя моманты, якое моцна мянялася на працягу мінулага стагоддзя.

Па-другое, фактычна гэта ілюстраваная храналогія па падзеях жыцця ад нараджэння да смерці паэта, а таксама тапаграфія, што ахоплівае практычна ўсе месцы, дзе Купала бываў, працаваў, меў зносіны і якія абесмяроціў у творах. Адносна апошняга варта адзначыць, што «тапаграфія Купалы», адлюстраваная ў калекцыі, мае вельмі каштоўны з пункту гледжання агульнага развіцця нацыянальнай культуры адваротны эфект: мясціны, асвечаныя яго імем, лёсам, творчасцю, у большасці музеефікаваліся, і гэты працэс працягваецца. Большасць з купалаўскіх мясцін увайшлі ў шырокі культурна-мастацкі абарот — таксама як, напрыклад, жыццёвыя маршруты Байрана, Пушкіна, Міцкевіча і іншых нацыянальных геніяў. Калекцыя музея выконвае ў гэтым працэсе вялікую ролю, валодае велізарным, яшчэ не цалкам рэалізаваным патэнцыялам.

І па-трэцяе, мастацкая калекцыя дапамагае шукаць адказы на пытанні, якія і па сёння застаюцца актуальнымі: што ёсць нацыянальнай школай выяўленчага мастацтва; ці з'яўляецца беларуская школа сапраўды самастойнай школай, а не сумай уплываў і не адгалінаваннем суседзяў з усходу, захаду, поўначы ці поўдня; ці мянялася ступень яе самастойнасці на працягу таго перыяду, што прадстаўляе калекцыя — ад нараджэння Купалы да сённяшніх дзён. Выяўленчае мастацтва з'яўляецца больш лакальнай плынню культуры, але тыя ж пытанні ідэнтычнасці можна аднесці да любой яе часткі, і калекцыя музея Янкі Купалы дапамагае тут найлепшым чынам, таму што і тэматычна яна звязана з цэнтральнай постаццю нацыянальнага адраджэння, і адносна жанраў і стыляў тут прадстаўлены ўвесь класічны спектр ад героіка-рамантычных і абагульнена-сімвалічных да сентыментальна-жанравых і іншых падыходаў да рашэння вобраза.

Альбом-каталог адлюстроўвае ўсе тры аспекты праз матэрыял, што аб'яднаны па раздзелах, дзе віды, жанры і храналогія мастацкіх твораў, імёны і месцы прыведзены ў сістэму па прынцыпе агульнага агляду. Гэта прынцып «адкрытага мноства», калі карыстаць матэматычную тэрміналогію, і выяўленчую купаліяну на гэтай базе далей можна дапаўняць, нарошчваць новымі экспанатамі, пакуль новыя творы будуць нараджацца. Прынцыповая пазіцыя «без адзнак», напрыклад, мастацкай каштоўнасці, таксама ўніверсальная, як і сам музей — «над сутыкненнем». Унікальныя лёс і роля Купалы, яго арэол не толькі героя, але і мучаніка (у калекцыі графічны ліст «Сумная аповесць роднай Беларусі» мастака М. Басалыгі, створаны



вугалем на паперы ў 1988-м «пасляперабудовачным» годзе, адзін з першых адкрыта дае неафіцыйную, але ўстойлівую ў грамадскай свядомасці версію трагічнай гібелі паэта) сапраўды аб'ядноўваюць нацыю. Музей, звязаны з імем Янкі Купалы, — гэта месца, куды можа прыйсці хто заўгодна: і традыцыяналіст, і мадэрніст, і нацыяналіст, і госць з далёкага ці блізкага замежжа, і культурна наіўны, і палітычна нейтральны чалавек любога ўзросту — і дзе кожны знаходзіць сваё.

Выяўленчая купаліяна з музейнай калекцыі храналагічна пачынаецца з таго перыяду, калі Купала стаў больш-менш пастаянна жыць у Мінску — з пачатку 1920-х гадоў. З неацэннага раздзела прыжыццёвых партрэтаў, якім адкрываецца альбом-каталог, варта адзначыць тры самыя раннія (усё 1921 года), створаныя з натуры рускім мастаком Дзмітрыем Полазавым, вучнем У. Макоўскага. Д. Полазаў у 1915 годзе пераехаў у Мінск, дзе выкладаў маляванне і сацыялогію мастацтва ў настаўніцкім інстытуце. З ім Янку Купалу звязвала вялікае асабістае сяброўства, яны часта наведвалі адзін аднаго ў сваіх мінскіх дамах. Ужо з 1922 года Д. Полазаў жыў і працаваў у Петраградзе/Ленінградзе, але сваімі творамі прымаў удзел у першай мінскай мастацкай выстаўцы 1925 года, на якой былі прадстаўлены яго партрэты Янкі Купалы, а таксама Якуба Коласа і іншых беларускіх пісьменнікаў. У сям'і Полазавых доўгі час захоўваліся прадметы і іншыя рэліквіі, звязаныя з народным паэтам Беларусі, якія потым былі перададзены музею Янкі Купалы ў Мінску дачкой мастака.

Полазаўскія партрэты Купалы, акрамя дакументальнай і мастацкай каштоўнасці, з'яўляюцца сведчаннем і плёнам глыбокіх зносін на глебе сумеснай дзейнасці: пасля рэвалюцыйных падзей і прыходу савецкай улады Д. Полазаў быў прызначаны кіраўніком Інстытута народнай адукацыі, а таксама старшынёй Экспедыцыі па вывучэнні беларускай народнай творчасці. Янка Купала прымаў разам з ім удзел у экспедыцыях па шэрагу раёнаў Беларусі, нароўні з М. Філіповічам, В. Цярэўскім, Ф. Ждановічам, М. Шкляевым, П. Гудкоўскім і іншымі аднадумцамі. Яны сабралі вялікую колькасць матэрыялаў па народным мастацтве Беларусі, што пазней ляглі ў аснову Дзяржаўнага Беларускага музея. Зыходзячы з гэтых фактаў, можна сказаць, што калекцыя музея Янкі Купалы мае экспанаты-сведчанні аб пачатку прафесійнай музейнай справы на Беларусі.

Прыклад адносін з Д. Полазавым паказвае, як, знаходзячыся на скрыжаванні культур, Купала ўспрыняў велізарны пласт расійскай спадчыны, карыстаючы прынцып «бяры лепшае ад іншых, каб зрабіць сваё». Сяброўства з мастакамі Пецярбурга/Петраграда/Ленінграда, а таксама Масквы і іншых цэнтраў выканала ў гэтым працэсе вялікую ролю, і ў калекцыі ёсць сведчанні гэтых стасункаў — як, напрыклад, прыжыццёвы партрэт Янкі Купалы 1930 года, створаны мастаком Канстанцінам Елісеевым, выпускніком Акадэміі мастацтваў, вучнем І.Я. Білібіна, вядомым расійскім кніжным ілюстратарам і сатырычным графікам. З К. Елісеевым Купалу моцна звязвала тэатральная плынь: у 1920—1921 гадах мастак жыў у Мінску, працаваў у першым Беларускім драматычным тэатры, дзе аформіў шэраг спектакляў, у тым ліку «Сон на кургане» Янкі Купалы (а таксама «Хам» Э. Ажэшкі і «На дне» М. Горкага, што дае цікавы кантэкст даследчыкам тэатральнай культуры пачатку 1920-х). Як і Купала, Елісееў сумесна з Полазавым ездзіў у экспедыцыі ў Слуцкую і Мінскую вобласці збіраць фальклорна-этнаграфічны матэрыял, уваходзіў у кола сапраўдных сяброў і аднадумцаў у справе вывучэння і захавання беларускай спадчыны. Неўзабаве Елісееў, як і Полазаў, пакінуў Беларусь і стаў у далейшым мастаком такіх папулярных сатырычных выданняў як «Гудок», «Пражэктар», «Чырвоны перац», «Кракадзіл» і многіх іншых, але падтрымліваў кантакты з Купалам.

Ужо бліжэй да нашага часу, да 100-гадовага юбілею Купалы, Мікалай Селяшчук стварыў жывапісны дыпціх, на кожным з каторых Купала адлюстраваны на фоне двух вельмі важных у яго жыцці гарадоў — Вільні і Пецярбурга. Калекцыя дазваляе праілюстраваць абодва культурна-геаграфічныя напрамкі дзейнасці Купалы — заходні і ўсходні.

Наступным па храналогіі з прыжыццёвых партрэтаў, якіх у адносінах да агульнай колькасці экспанатаў калекцыі зусім няшмат, ёсць жывапісны твор 1923 года

Якава Кругера, мінскага жывапісца і вядомага педагога. Я.Кругер з'яўляецца адным са стваральнікаў прафесійнай мастацкай адукацыі ў Беларусі. Курсы малявання і жывапісу Я. Кругера, адкрытыя ў 1904 годзе ў Мінску, у 1906-м былі афіцыйна ператвораны ў школу. Гэта імя цяпер цікавіць даследчыкаў яшчэ і таму, што ў школе Кругера на пачатку творчага шляху вучыліся ўраджэнцы Беларусі, якія потым сталі вядучымі мастакамі так званай Парыжскай школы, напрыклад Х. Суцін (чарговае паленца ў вогнішча палымяных дыскусій аб тым, хто тут ёсць чыім). Як і Купала, Кругер быў звязаны з мастацкімі коламі бліжэйшых і далёкіх сталіц, вучыўся ў Кіеве, Санкт-Пецярбургу, Варшаве, Парыжы і, дзе мог, «браў лепшае», каб у 1900-м г. вярнуцца ў Мінск і развіваць мастацтва на радзіме.

Партрэт Янкі Купалы быў выкананы Я. Кругерам па дзяржаўным заказе для Дома пісьменнікаў у Мінску, у шэрагу партрэтаў іншых беларускіх літаратараў. Дакументальная дакладнасць і адлюстраванне асабістых адносін мастака да паэта, з якім ён быў блізка знаёмы, не вычэрпваюць вартасцяў твора. Партрэт прадстаўляе беларускі жывапіс перыяду станаўлення беларускай дзяржаўнасці, што надае яму дадатковую каштоўнасць. Тое, што ў гэты перыяд свядома ствараўся новы пантэон нацыянальнай літаратуры, для Я. Кругера не было прынцыпова новай канцэпцыяй. Яшчэ ў 1900—1910-х гадах мастак атрымаў вядомасць як партрэтыст дзякуючы серыі, у якой захаваў вобразы менавіта тутэйшай творчай інтэлігенцыі. Яго творчасць значна паўплывала на далейшае развіццё беларускага парадная партрэта ўжо ў савецкія часы. Улічваючы тое, што значная частка творчай спадчыны Я. Кругера была страчана ў гады Вялікай Айчыннай вайны, жывапісныя партрэты першых народных паэтаў Беларусі Янкі Купалы і Якуба Коласа ўзмацняюць каштоўнасць калекцыі Дзяржаўнага літаратурнага музея Янкі Купалы менавіта як мастацкага збору.



У тым жа раздзеле прыжыццёвых партрэтаў звяртае на сябе ўвагу праца Абрама Бразера 1930 года. Гэта выразны партрэт, намаляваны тушшу на паперы цвёрдай рукой скульптара, якая экспрэсіўна лепіць форму неардынарнай знешнасці Купалы і адлюстроўвае псіхалагічны стан велізарнага напружання. Бразер вучыўся ў Парыжы да таго, як вярнуўся ў Мінск будаваць новае мастацтва новай краіны, і яго экспрэсіўны стыль часам пераклікаецца з фармальнымі пошукамі мастакоў-мадэрністаў так званай Парыжскай школы, у значнай колькасці выхадцаў з Беларусі.

Як і ў выпадку з Кругерам, дый наогул з даваеннай беларускай мастацкай спадчынай, гэта таксама каштоўна ўжо проста таму, што захавалася. Шмат твораў таленавітага мастака страчана ў выніку драматычных абставін вайны: вялікая персанальная выстава А. Бразера адкрылася ў Мінску ў чэрвені 1941 года, за некалькі дзён да пачатку Вялікай Айчыннай, і ўсе працы з гэтай выстаўкі былі знішчаны нямецкімі акупантамі пасля захопу горада, а сам мастак з сям'ёй у сакавіку 1942 года расстраляны ў мінскім гета. І Янка Купала, і А. Бразер сышлі з жыцця ў адзін год, абодва сталі ахвярамі вайны. Імя Бразера займае асаблівае месца ў калекцыі яшчэ і таму, што з яго пачынаецца скульптурная купаліяна: існуе фотаздымак з дароўным надпісам мастаку Юдовіну, які сведчыць, што Бразер выканаў прыжыццёвы скульптурны партрэт Купалы.

Падборку імёнаў аўтараў прыжыццёвых партрэтаў Купалы з калекцыі музея сімвалічна дапаўняе ўкраінскі мастак, адзін з актывістаў украінскага культурнага адраджэння, папулярызатар малюнкаў Т. Шаўчэнкі, стваральнік агульнадаступнай выяўленчай «шаўчэнкіяды» Фоцій Красіцкі. Створаная ім яшчэ ў 1905—1906-х гадах аўталітаграфія з выявай класіка ўкраінскай літаратуры стала сусветна вядомая дзякуючы выданню ў выглядзе паштоўкі. Ф. Красіцкі выканаў алоўкам партрэтны накід Янкі Купалы ў 1939 годзе, у вельмі цяжкі для сябе час: практычна ўсе члены яго сям'і альбо загінулі, альбо знаходзіліся ў турмах НКУС і лагерах. Магчыма, малюючы Купалу за пару гадоў да яго гібелі, ён адчуў і яго будучы трагічны лёс. Гэтак жа, як і у А. Бразера, у Ф. Красіцкага першая і адзіная ў жыцці выстаўка працавала ўсяго адзін дзень у канцы чэрвеня 1941 года. Ратуючы карціны ад бамбёжкі, ён закапаў іх у зямлю. У адрозненне ад Бразера і Купалы, Красіцкі ўсё-ткі дажыў да вызвалення свайго горада (Кіева), але памёр адразу ж пасля гэтага ў 1944 годзе.

На прыкладзе Ф. Красіцкага і іншых аўтараў прыжыццёвых партрэтаў можна ўсвядоміць, наколькі мастацкая калекцыя музея Янкі Купалы значная ў якасці крыніцы для іншых музеяў — як мемарыяльных, так і мастацкіх, звязаных з захаваннем памяці аўтараў гэтых партрэтаў як дзеячаў айчыннай і суседніх культур. З гэтай нагоды калекцыя ўяўляе сабой плённую аснову для міжмузейнага, у тым ліку міжнароднага, супрацоўніцтва і камунікацыі, балазе круг зносін і геаграфія перасоўванняў Янкі Купалы, яго ўплыў былі вельмі шырокімі, выходзілі далёка за межы Беларусі.

Адным з апошніх прыжыццёвых партрэтаў з'яўляецца алоўкавы партрэт-замалёўка, выкананы Ісакам Давідовічам у 1941 годзе. Мастак ухапіў вельмі жывую і характэрную позу Купалы, які паглыбіўся ў нейкі тэкст. Якую кнігу ён чытае ў гэтым страшным годзе, за год да сваёй смерці? Чытае так паглыблена, засяроджана? Можа, знаходзіць у чыіхсьці словах апору духоўную? Або вычытвае свае гранкі? Мы не ведаем дакладна, але задаемся гэтымі пытаннямі ў кантэксце музея і яго экспазіцыі. І. Давідовіч належыць да тых мастакоў, чые імёны ўпісаны ў гісторыю беларускага мастацтва шмат у чым дзякуючы жывому дотыку да Купалы. У музеі захоўваецца дзевяць яго жывапісных і графічных твораў.



Прыжыццёвых скульптурных партрэтаў Купалы, на жаль, у мастацкай калекцыі няма. Ёсць толькі сведчанні аб тых творах, што былі выкананы з натуры ці на аснове натурных замалёвак — як, напрыклад, узгаданы бюст А. Бразера. Але ў адпаведным раздзеле альбома-каталога, дзе пералічаныя ўсе скульптурныя выявы з калекцыі, прысутнічаюць імёны буйнейшых дзеячоў беларускай скульптуры, прадстаўлены ўсе класічныя скульптурныя жанры (адзіночныя і групавыя партрэты, сюжэтныя кампазіцыі і мадэлі помнікаў, дэкаратыўныя творы) і разнастайныя матэрыялы — мармур, бронза, сілумін, гіпс, шамот, дрэва і іншыя, нават косць маманта.

У дакументальным сэнсе сярод пасмяротных асабліва каштоўныя партрэты, зробленыя мастакамі, якія асабіста ведалі Купалу, абапіраліся на рэальныя назіранні гэтай няпростай для адлюстравання мадэлі. Перш за ўсё гэта скульптары старэйшага пакалення, заснавальнікі прафесійнай скульптурнай школы ў Беларусі і сябры паміж сабой Аляксей Глебаў і Андрэй Бембель, якія шмат працавалі ў Мінску перадваенным, на працягу 1930-х — самым пачатку 1940-х, і мелі магчымасць сустракацца з Купалам у разнастайных сітуацыях гарадскога жыцця. А. Глебаў і А. Бембель абодва скончылі Віцебскі мастацкі тэхнікум — асноўную мастацкую

навучальную ўстанову Беларусі ў міжваенны час — і прымалі непасрэдны ўдзел у стварэнні кафедры скульптуры ў Беларускім дзяржаўным тэатральна-мастацкім інстытуце пасля Вялікай Айчыннай вайны.

Наогул, мастацкая калекцыя музея сведчыць, што ў асноўным калектыў прафесійных мастакоў Беларусі савецкай сфарміраваўся ў 1930-я гады менавіта з выпускнікоў Віцебскага мастацкага тэхнікума. Сярод іх паказальны лёс, напрыклад, Валянціна Ціхановіча, які пасля заканчэння тэхнікума пачаў працаваць у галіне станковай, кніжнай і сатырычнай графікі. Ужо тады праявілася адоранасць В. Ціхановіча як анімаліста, і ў той час ён меў па гэтым напрамку заўважны ўплыў ленінградскіх графікаў, асабліва вядомага Я. Чарушына. Але ў цэлым вопыт маладых беларускіх ілюстратараў у той час быў невялікі, і пры агульнай станоўчай ацэнцы творчасці большасці з іх трэба адзначыць, што беларуская графіка гэтай генерацыі толькі імкнулася да ўзроўню лепшых твораў савецкага графічнага мастацтва міжваеннай эпохі, якія ствараліся перш за ўсё на базе бліскучых школ Масквы і Санкт-Пецярбурга/Петраграда/Ленінграда. В. Ціхановіч перажыў акупацыю ў Мінску, як і шэраг яго сяброў і калег, і шлях беларускіх майстроў кнігі быў паспяхова працягнуты ў пасляваенныя гады, пра што сведчыць калекцыя музея Янкі Купалы. Малодшы сучаснік паэта В. Ціхановіч зрабіў у 1945 годзе сімвалічную акварэльную ілюстрацыю да яго знакамітага верша «Я мужык-беларус...», напісанага ў [1905—1907] гадах.

Мастакі-графікі з Заходняй Беларусі, як, напрыклад, Міхась Сеўрук, што атрымалі мастацкую адукацыю і выкшталцоную графічную падрыхтоўку ў Віленскім універсітэце, працавалі да 1939 года ў сістэме мастацкага жыцця Польшчы. Але пасля аб'яднання Заходняй і Усходняй Беларусі тыя, хто не трапіў пад рэпрэсіі, працягвалі працаваць, і іх творы таксама ёсць у калекцыі. Асаблівую каштоўнасць маюць працы даваеннага перыяду. Перш за ўсё трэба назваць карціну Пятра Сергіевіча «Шляхам жыцця» (1934), натхнёную аднайменным зборнікам вершаў Янкі Купалы 1913 года. Купалаўская тэма, вобраз паэта займаюць значнае месца ў творчасці П. Сергіевіча, а фонды Дзяржаўнага літаратурнага музея Янкі Купалы ў Мінску налічваюць 14 карцін мастака. Сярод іх «А хто там ідзе?» (1945); «Беларусы» (1945, паводле верша «А хто там ідзе?» ); палатно «Званар» (1946, па матывах твора «Званы» 1918 года); «А ты, сірацiна, жыві» (1942); «Гусляр»; эцюды на тэмы паэмы Янкі Купалы «Яна і я» («Ворыва» і «На сенажаці», абодва 1959 года); «Партрэт Францішка Багушэвіча» (1944). Ілюстрацыі да твораў Янкі Купалы і натхнёныя імі творы складаюць раздзел альбома-каталога, які багата дапаўняе гісторыю мастацтва Беларусі.

П. Сергіевіч, як і М. Сеўрук, як ужо сказана вышэй, прадстаўляюць у калекцыі іншую крыніцу фарміравання нацыянальных кадраў выяўленчага мастацтва. Першапачатковыя мастацкія навыкі П. Сергіевіч атрымаў у Вольнай школе малявання і жывапісу Адама Варнаса ў Вільні. Потым вучыўся на мастацкім факультэце Віленскага ўніверсітэта (1919—1922) у Ф. Рушчыца і Л. Слянздзінскага, затым — у Кракаўскай Акадэміі мастацтваў (1924—1925). Сергіевіч працаваў таксама ў станковай і кніжнай графіцы, пісаў абразы, працаваў як манументаліст, ён з'яўляецца аўтарам роспісаў шэрагу касцёлаў — у Солах, Жодзішках, Смаргоні і іншых. У 1940-х гадах прымаў удзел у перадачы каштоўнасцяў Беларускага музея з Вільні ў Мінск, і гэты факт працягвае лінію, пачатую яшчэ ў 1920-я гады, якая сведчыць аб звязку калекцыі музея Янкі Купалы праз прадстаўленых мастакоў з гісторыяй прафесійнай музейнай справы ў нашай краіне.

З ваенным часам звязаны вельмі драматычныя лёсы некаторых мастакоў, чые творы ёсць у калекцыі — як, напрыклад, акварэль графіка Паўла Гудкоўскага «Магіла льва». Таленавіты мастак, П. Гудкоўскі прымаў удзел у верасьнёўскай выставе 1921 года ў Мінску побач з М. Філіповічам, І. Пляшчынскім, І. Валадзько, П. Мрачкоўскай і іншымі; у тым жа 1921 годзе працаваў у складзе ўжо ўзгаданай вышэй этнаграфічнай экспедыцыі па Беларусі пад кіраўніцтвам Д. Полазава, потым — у Мінскім мастацкім камбінаце. Падчас акупацыі працаваў гравёрам у рэдакцыі нямецкіх газет, што друкаваліся ў Мінску, і ў 1945 годзе быў асуджаны за «супрацоўніцтва з нямецкімі ўладамі ў перыяд акупацыі» да 10 гадоў выпраўленча-працоўных работ з канфіскацыяй маёмасці. П. Гудкоўскі быў рэабілітаваны судовай калегіяй па крымінальных справах Вярхоўнага суда БССР у 1956 годзе, калі высветлілася, што прысуд быў неправамерным, бо Гудкоўскі пайшоў на супрацоўніцтва з мэтай выратавання свайго сына Мікалая, арыштаванага за дапамогу яўрэям (займаўся падробкай пашпарта і дакументаў). Сын быў расстраляны ў 1942 годзе, але Гудкоўскі аб гэтым не ведаў і спадзяваўся неяк аблегчыць яго лёс.

Пасляваенны этап купаліяны вельмі разнастайны, ён ахоплівае ўсё больш шырокія колы мастакоў. Пачаць разглядаць гэты перыяд варта з глебаўскай манументальнай постаці Купалы 1943 года з таніраванага пад бронзу гіпса, які назірае за сучасным жыццём музея ў яго выставачнай зале з вышыні сваіх 2,7 метраў. Акрамя вялікай постаці чалавека, які горда і велічна ідзе, у калекцыі зберагаюцца яшчэ сем скульптур (датаваныя 1946, 1948, 1949, 1955, і 1962 гадамі) А. Глебава, імем якога цяпер названа мастацкае вучылішча ў Мінску.

А. Глебаў вяртаўся да вобразаў самога Купалы і яго творчасці зноў і зноў, да свайго ранняга зыходу з жыцця ў поўным росквіце творчых сіл у 1968 годзе. Выдатны скульптар аддаў даніну і кананічнаму для савецкай іканаграфіі жанру парнага партрэту, згодна з якім звычайна дэманстравалася шчыльнае сяброўства таго ці іншага прадстаўніка нацыянальнай культуры адной з савецкіх «рэспублікі-сясцёр» і галоўнага агульнасаюзнага дзеяча канкрэтнай культурнай галіны: у дадзеным выпадку гэта Купала і Горкі. У калекцыі таксама зберагаецца адзін з лепшых варыянтаў манументалізаванай інтэрпрэтацыі вобраза паэта, які адліты ў метале ўжо пасля зыходу А. Глебава з жыцця, у 1970-х гадах. Глебаву ўдалося стварыць Купалу сапраўды велічным, глыбокім, унутрана значным, без празмернай пафаснай рыторыкі, з бездакорным густам і адчуваннем меры. А. Бембель нібыта падхапіў і тэму, і настрой творчасці сябра, які сышоў, і ў мармуры даў героіка-рамантычную трактоўку вобраза Купалы. Паэт у яго трактоўцы 1972 года — рашучы, прыгожы, моцны чалавек, віртуозна і разам з тым лаканічна выкананы на кантрасце тонка прапрацаванага твару і лапідарна абсечанага каменю, з якога нібыта нараджаецца гэты твар.

Паасобку ад скульптуры ў адзіны раздзел сабрана мноства рэтраспектыўных жывапісных і графічных партрэтаў Купалы, створаных пачынаючы з самых першых гадоў пасля яго смерці і па сённяшні дзень. Найранейшыя з пасмяротных жывапісных партрэтаў Купалы ў калекцыі — работы пэндзля Валянціна Волкава і Івана Ахрэмчыка, абодва 1945 года. І абодва творцы — Волкаў яшчэ з 1920-х, а Ахрэмчык пачынаючы з 1940-х, — зрабілі вялікі ўклад у развіццё нацыянальнай культуры не толькі як мастакі, але і як выдатныя настаўнікі. Імі на матэрыяле калекцыі музея Янкі Купалы працягваецца тэма станаўлення беларускай школы выяўленчага мастацтва, распачатая з Я. Кругера. З В. Волкавым звязаны даваенныя педагагічныя актыўнасці, а І. Ахрэмчык узначальваў кафедру жывапісу і кампазіцыі ў Беларускім тэатральна-мастацкім інстытуце (цяпер Беларуская дзяржаўная акадэмія мастацтваў) ужо пасля вайны, на этапе станаўлення першага сталічнага мастацкага вуза. Тады ж будавалася і акадэмічная сістэма навучання на кафедры скульптуры, дзе цяпер выхоўваліся новыя пакаленні майстроў.

Сярод тых, хто адным з першых стаў ствараць жывапісныя партрэты Янкі Купалы пасля яго смерці, быў і С. Андруховіч. У каталозе прадстаўлена яго праца 1949 года. Андруховіч меў магчымасць абапірацца на асабістыя ўражанні: з Купалам ён быў знаёмы з 1938 года; часта гасціў у Мінскім доме па адрасе вул. Кастрычніцкая, 40; выканаў цэлы шэраг яго партрэтаў у розныя гады. Акрамя згаданага ёсць працы 1962 і 1979 гадоў, а таксама найбольш вядомая карціна Андруховіча на купалаўскую тэму — «Янка Купала з маці», створаная разам з Генрыхам Бржазоўскім у 1951 годзе. Жанравая карціна з'яўляецца адначасова падвоеным партрэтам, паказвае паэта з яго маці Б.І. Луцэвіч каля дома ў Мінску, дзе яны жылі ў 1926—1941 гадах. Карціна адкрывае важную частку альбома-каталога, дзе сабраны сюжэтныя карціны і партрэты змешанага жанру — партрэты-пейзажы, партрэты-мізансцэны і іншыя варыянты інтэрпрэтацыі мастакамі эпізодаў і фактаў біяграфіі Купалы.

Прыкладам экспаната калекцыі з гэтага раздзела можа служыць партрэт-карціна малодшага прадстаўніка дынастыі мастакоў Волкавых — Анатоля Волкава, які напісаў у гэтым жа 1949 годзе палатно «Янка Купала на адпачынку». А. Волкаў таксама зрабіў шэраг акварэльных ілюстрацый да вершаў (напрыклад, «Хлопчык і лётчык» і «Госці», абедзве 1945 года), якія можна пабачыць у асобным раздзеле альбома-каталога, дзе аб'яднаны ўсе ілюстрацыі да літаратурных твораў Купалы з калекцыі. Дарэчы, «Хлопчык і лётчык», напісаны ў чэрвені 1935 года ў Ляўках, як адзін з самых папулярных вершаў Купалы натхніў шмат мастакоў розных пакаленняў на ілюстраванне і ў жывапісных, і ў графічных тэхніках. Сярод іх Барыс Забораў (лінагравюра, 1966); Уладзімір Басалыга (акварэль, гуаш, 1972); Міхаіл Савіцкі (палатно «Мара», 1981) і іншыя.

Тое ж можна сказаць пра ўзгаданы верш «Як у госці сын прыехаў...», напісаны Янкам Купалам таксама ў Ляўках у ліпені 1935 года. Дзмітрый Красільнікаў, які пазней стаў галоўным мастаком газеты-плаката «Раздавім фашысцкую гадзіну» (выходзіў з 1941 года, у мірны час стаўшы часопісам «Вожык»), стварыў акварэльную ілюстрацыю да гэтага верша ў 1945 годзе. Д. Красільнікаў добраахвотна пайшоў на фронт, працаваў над баявым выданнем-агітплакатам побач з такімі мастакамі-прафесіяналамі, як А. Шаўчэнка, З. Азгур, Б. Звінагродскі і іншыя. Пасля вайны Д. Красільнікаў праілюстраваў многія творы беларускіх аўтараў, у тым ліку творы Янкі Купалы.

Да першага паваеннага дзесяцігоддзя належаць партрэты Купалы 1951 і 1956 гадоў пэндзля Акіма Шаўчэнкі — аднаго з выдатных каларыстаў свайго пакалення беларускіх мастакоў, які маляваў Купалу, абапіраючыся на асабістыя ўспаміны і ўражанні. Спадчына мастака прадстаўлена і ў Нацыянальным мастацкім музеі, яго статус у гісторыі айчыннага мастацтва вызначаны, але па факце Шаўчэнка незаслужана знаходзіцца ў цені сваіх сучаснікаў. Экспанаты калекцыі музея Янкі Купалы вельмі спатрэбяцца, калі яго творчасцю сур'ёзна зоймуцца даследчыкі, хаця б таму, што А. Шаўчэнка вучыўся ў такіх выдатных майстроў расійскай школы жывапісу, як С. Герасімаў, А. Дрэвін, Д. Штэрэнберг, і перадаваў свае творчыя прынцыпы вучням, сярод якіх М. Савіцкі, М. Данцыг, Г. Паплаўскі, В. Грамыка, В. Шаранговіч, Л. Дударэнка і іншыя, цяпер ужо самі класікі і прызнаныя майстры. А. Шаўчэнка ў кантэксце дадзенай калекцыі цікавы таксама як аўтар цэлага цыкла фігуратыўных карцін, дзе галоўнымі героямі з'яўляюцца Янка Купала і Якуб Колас.

Такім чынам, мастацкая калекцыя паказвае, як тыя, хто пісаў і маляваў Янку Купалу з натуры, а потым тыя, хто пісаў і маляваў яго па памяці, захоўваючы жывое адчуванне ад асобы паэта, стварылі падмурак, на які абапіраюцца мастакі наступных пакаленняў, аж да нашых дзён — тыя, хто стварае яго вобраз па ўяўленні і хто інтэрпрэтуе яго ў адпаведнасці з уласным разуменнем і выклікамі свайго часу.

Пасля вайны, у 1950—60-х пачало актывізавацца мастацкае жыццё, з'явіўся шэраг скульптурных твораў, якія прадстаўляюць у калекцыі вядучых аўтараў літаральна па гадах: падвоены партрэт «Янка Купала і Якуб Колас» Сяргея Селіханава (1952, гіпс таніраваны) і адзіночныя партрэты Купалы В. Міхельсона (1953, слановая косць, разьба); Льва і Марка Роберманаў (1954, 1956 і 1957, гіпс); Аляксандра Рыбкіна (1955, гіпс); Васіля Макухі (1958, мармур); Мікалая Палякова (1958, мармур); Сяргея Селіханава (1962, гіпс).

1970-я ярка прадстаўлены ў калекцыі графікай Васіля Шаранговіча, Георгія Паплаўскага, Арлена Кашкурэвіча. Побач з мэтрамі канчаткова зацвердзілася сваімі творамі другое пакаленне скульптараў. Вучань А. Бембеля Анатоль Анікейчык прадстаўлены ў калекцыі партрэтам Янкі Купалы (1978, гіпс) і мадэллю помніка (1981), што ўстаноўлены цяпер у парку імя Янкі Купалы ў Мінску на падыходзе да музея. Фактычна гэты помнік з'яўляецца пачаткам экспазіцыі музея яшчэ да ўвахода ў яго, як і фантан «Купалле» побач з музеем. Павел Лук у сваім бронзавым Купале інтэрпрэтуе вобраз, знойдзены на пакаленне раней А. Глебавым. Працы гэтага перыяду фіксуюць новы этап асэнсавання памяці аб Купале напярэдадні 100-гадовага юбілею.



Да 1981 года належыць партрэт-пейзаж Г. Бржазоўскага «Янка Купала на Садовай набярэжнай у Мінску». Майстар партрэта і жанравай, сюжэтнай карціны Г. Бржазоўскі памятаў Мінск перадваенны, калі вучыўся ў мастацкай студыі Ф. Мадорава ў 1938—1941 гадах і меў магчымасць час ад часу сустракаць і назіраць Купалу. Палатно напісана напярэдадні стагоддзя Янкі Купалы, калі адбыўся сапраўдны бум сярод мастакоў па купалаўскай тэме. Сярод вялізнага шэрагу новых твораў варта адзначыць натхнёныя вершам «Я — калгасніца, маладая», напісаным у 1934 годзе ў калгасе «Чырвоны баец» Барысаўскага раёна. Гэта палатно М. Савіцкага «Калгасніца» і афорт М. Басалыгі, які потым быў уключаны як ілюстрацыя ў юбілейнае выданне твораў Янкі Купалы «Выбранае. Паэмы» (Мінск, «Мастацкая літаратура», 1982).

Юбілейнае выданне, дарэчы, аб'яднала шмат мастакоў розных пакаленняў. Сярод іх Юрый Зайцаў, вучань Г. Коржава і С. Герасімава, выхаванец Маскоўскага вышэйшага мастацка-прамысловага вучылішча, прадстаўлены алоўкавым малюнкам да верша «Як я полем іду...» (напісаны ў [1909] годзе і ўпершыню надрукаваны у газеце «Наша Ніва»). З маладых мастакоў варта адзначыць Рыгора Сітніцу з аўталітаграфіяй 1981 года «К лепшай долі, з вялікай надзеяй», ілюстрацыяй да кнігі Янкі Купалы «Выбранае» (Мінск, «Мастацкая літаратура», 1981). Купала-заступнік, Купала-абаронца, Купала-пакутнік, літаральна мясцовы святы — такая іканаграфія і трактоўка складваецца ў гэты час росквіту беларускай графікі на глебе нацыянальнага адраджэння, сімвалам якой быў і застаецца Купала. У гэты час узнікнення адраджэнскіх гурткоў-суполак ён стаў іх сцягам і паролем.

Яшчэ з 1960-х гадоў назіраецца актыўнае развіццё беларускага эстампа: спачатку ўздым адчуваўся у лінагравюры, затым — у літаграфіі, трохі пазней — у афорце. У гэты час эстамп становіцца значнай з'явай у беларускім выяўленчым мастацтве. А з нагоды юбілейнай актыўнасці бліжэй да пачатку 1980-х з новай сілай пачалі развівацца не толькі разнастайныя графічныя тэхнікі, але і іканаграфія і каноны адлюстравання самога Купалы і яго твораў.

Прыкладам графічнай купаліяны 1970-х — першай паловы 1980-х ёсць творы Міхаіла Басалыгі, які займаўся пераважна мастацкім афармленнем кніг. Ён аздобіў выданні і зрабіў ілюстрацыі да кнігі Янкі Купалы «Вершы і паэмы» (1982) і шэрагу іншых. Некаторыя працы зроблены ў сааўтарстве з братам, мастаком Уладзімірам Басалыгам. У тэхніцы каляровай лінагравюры зроблена ім серыя работ па матывах паэмы Янкі Купалы «Курган» (1981), у 1982 годзе выканана серыя каляровых афортаў, аб'яднаных назвай «Па матывах твораў Я. Купалы».

Да стагоддзя Янкі Купалы (а адначасова і Якуба Коласа) у 1982 годзе шмат папрацавалі і скульптары, работы якіх ёсць і ў калекцыі: твор Алены Хараберуш «Паэты» (1982, бронза, граніт); двухфігурная кампазіцыя Акіма Курачкіна «За волю, за долю» (1982), дзе лірнік і хлопчык увасабляюць перадачу спадчыны ад мудрага сталага чалавека да юнака сродкамі мастацтва. Скульптар Уладзімір Лятун працаваў над купалаўскай тэмай некалькі дзесяцігоддзяў, і калекцыя музея дазваляе прасачыць яго эвалюцыю мастака: акрамя юбілейнага партрэтнага вобраза (1982, сілумін) у калекцыі ёсць творы і 1948, і 1985, і 1990 гадоў).

Унутры калекцыі цікава параўноўваць адны і тыя ж матывы і сюжэты — напрыклад, двух «Гусляроў» з розніцай часу стварэння амаль у паўстагоддзя, адзін — гродзенскага скульптара Алеся Ліпеня 1957 года з таніраванага пад бронзу гіпса, а другі — Алеся Шаціла 2010 года з шамоту і дрэва. Як ужо было адзначана на прыкладзе У. Лятуна, цікава на матэрыялах калекцыі параўноўваць выдатных мастакоў з імі ж самімі. Зноў і зноў вяртаецца да партрэтаў Купалы графік М. Басалыга, які акрамя акадэмічных па форме, часам стылізаваных пад класіку партрэтаў стварае і іншыя, часцей за ўсё сімвалічна-жанравыя, творы.

Праз дзесяцігоддзе, калі набыццё незалежнасці ў 1991 годзе дало новыя выклікі, тагачасная іканаграфія Купалы таксама дала шмат цікавага матэрыялу для роздуму, даследаванняў і разумення сітуацыі. Цікава назіраць, чым адгукнулася старая гвардыя (бронзавы партрэт Купалы Генадзя Мурамцава, 1992) і як канон захоўваецца цяпер: на двары трэцяе тысячагоддзе, а Янка Купала Валяр'яна

Янушкевіча (2002, бронза), Льва і Сяргея Гумілеўскіх (2008) традыцыйна хутаецца ў бронзавае паліто ля драўлянай лаўкі з разгорнутай кнігай, пад якой расце папараць-кветка. Рамантычная задуменнасць як сюжэт твора застаецца нязменнай у рэалістычных формах гэтых скульптур. Больш разняволенасці і стылістычных пошукаў дэманструе драўляная скульптура: «Музыка» і «Гэй ты, дзяўчына, кветка-лілея. Вольная птушка сумнай зямлі…» С. Гумілеўскага (абедзве 2007, дрэва, разьба); сімвалічны твор В. Казлоўскага «Крыж па жыцці» (2007, дуб, разьба); «Мая доля» А. Пупко (дрэва, разьба) і адразу два драўляныя розныя творы на верш «Я мужык-беларус» — А. Пупко і К. Аляксеева.

Унеслі свой уклад у юбілейны парад мастацтва і графікі: трыпціх 1982 года, створаны Анатолем Александровічам у тэхніцы афорта да верша «Я ад вас далёка…» (напісанага 30.07.1910 ў Пецярбургу і ўпершыню надрукаванага ў газеце «Наша Ніва» 12.08.1910), адлюстроўвае важны момант усведамлення нацыянальнай тоеснасці, якое абвастраецца на аддаленасці ад радзімы. Інтэрпрэтацыі А. Александровічам літаратурных твораў хрэстаматыйных і сучасных беларускіх аўтараў узбуджаюць жаданне перачытаць гэтыя тэксты. Мастак шмат эксперыментаваў з тэхналогіямі, што таксама вылучае яго як адну са значных постацяў беларускай графікі перыяду яе росквіту ў другой палове ХХ стагоддзя. І яшчэ адзін Александровіч — Віктар, таксама прадстаўлены ілюстрацыяй да купалаўскага верша «Чаго б я хацеў» (напісанага ў 1905 годзе і ўпершыню надрукаванага ў першым зборніку «Жалейка» 1908 года) пад назвай «...Замёрлі і сіла і дух!». В. Александровіч працаваў пераважна ў галіне станковай графікі, пазней — кніжнай, як ілюстратар твораў мастацкай літаратуры, і, у прыватнасці, Купалы. З ранніх работ — літаграфічная серыя «Адвечная песня» па матывах паэмы Янкі Купалы (1979) і «Вершы Янкі Купалы» (кніжка-мініяцюра, 1982).

Атрыманне незалежнасці натхніла мастака Аляксея Марачкіна на карціну «Успамін аб маёй вёсцы». Яна была створана ў 1992 годзе як ілюстрацыя да зборніка твораў Янкі Купалы «Жыве Беларусь». А партрэт паэта аўтарства Іосіфа Белановіча (1992, афорт) сведчыць аб тым, што ў статусе партрэтаванага для школьных кабінетаў класіка Купала перайшоў і ў новую эпоху.

Падрыхтаваны супрацоўнікамі Дзяржаўнага літаратурнага музея Янкі Купалы альбом-каталог з’яўляецца вельмі своечасова ў эпоху пошуку новых ідэнтычнасцяў у грамадстве, дзе даволі няшмат гістарычных фігур, што аб’ядноўваюць усе пласты і сацыяльныя групы без выключэння: жывём, спраўджваючыся з Купалам, і пасля таго, як сістэмныя сацыяльныя пераўтварэнні змянілі постсавецкую прастору, і пасля таго, як Рэспубліка Беларусь здабыла дзяржаўнасць. Янка Купала належыць да такіх універсальных постацяў, а яго музей такім чынам можа быць месцам аб’яднання і прымірэння.

Візуальная прэзентацыя нацыянальнага героя (у дадзеным выпадку героя нацыянальнай культуры) — рэч няпростая. І яна сімптаматычная, яна — тэст. І для аўтара інтэрпрэтацыі, і для таго часу, у які ён жыве. Ад таго, хто названы героем у бягучы момант, залежыць і наша адзнака часу, эпохі. Мы бачым кожны дзень, як многія з былых герояў цалкам страцілі былую вядомасць, часта штучную, а нехта, наадварот, выняты з нябыту, з забыцця, насуперак намаганням былых «будаўнікоў гісторыі». Якім мы бачым Купалу цяпер? Якімі бачым сябе ў ім? Купала, як атрымліваецца па факце, — герой на ўсе часы. У адрозненне ад многіх сваіх равеснікаў, ён працягвае быць актуальным, яго прачытваюць зноў і зноў, і часам нечакана.

Аглядаючы мастацкую калекцыю музея, бачым, што аддаць рытуальную даніну Купалу — святая справа амаль кожнага беларускага мастака. Кожны хоча дакрануцца да яго. Чаму? Таму што для кожнага знойдзецца ў Купалы свой радок, свой настрой, адпаведны літаратурны фармат і старонка біяграфіі. І таму, што ўнікальна шырокі і ёмісты вобраз Купалы прымаюць амаль усе, кожны можа пабачыць у гэтым люстэрку сваё адлюстраванне. Тыя, для каго гэта прынцыпова, нават даруюць яму вершы, прысвечаныя бальшавіцкім поспехам. Яго роля пакутніка напрыканцы жыцця



ўсё загладзіла. Смерць Купалы натхняе творцаў і не з Беларусі: у калекцыі ёсць палатно 1995 года мастака з Казані Айдара Хісамава «Янка Купала ў Пячышчах 1942 г. (Казань)», дзе позірк паэта нібыта прасякнуты прадчуваннем свайго непазбежнага ахвярнага лёсу. Кампазіцыя з бронзы і граніту Л. Гумілеўскага на верш (За ўсё) Янкі Купалы «Я адплаціў народу, чым моц мая магла...» (2009) пераклікаецца з узгаданым графічным лістом М. Басалыгі «Сумная аповесць роднай Беларусі» (1988) і магла б быць дастойным надмагільным помнікам паэта, чыя загадкавая гібель упісала яго ў шэраг тых, хто загінуў за свае ідэі і ідэалы, хоць і на нябачным фронце, не ў лагеры і не ў акопе.

Калекцыя кажа нам вельмі важную рэч: што разважанні пра класікаў і адносіны з імі — яшчэ і выклік для нашчадкаў. Калі Янка Купала жыў у Мінску ў другой палове 1930-х, у атмасферы напружання і адчуванні блізкай небяспекі, У. Набокаў у далёкім ад Мінска Парыжы напісаў эсэ пра глыбока асабістыя і жыццёва важныя для яго пошукі праўды ў шматлікіх трактоўках творчасці і асобы А.С. Пушкіна. У эсэ, напісаным напярэдадні 100-годдзя смерці паэта, Набокаў гаворыць і пра візуальныя інтэрпрэтацыі выявы Пушкіна. Пісьменнік намацвае розніцу паміж праўдай і праўдападабенствам у вобразе генія, што зноў і зноў ствараецца і шматкроць паўтараецца той культурай, дзе гэты геній мае статус заснавальніка. «...Я напінаўся з усіх сіл, каб апісаць сапраўды непераадольныя цяжкасці, што ўзнікаюць перад самым даверлівым розумам, калі ён спрабуе ўваскрэсіць не з рамантычным праўдападабенствам, а адзіна праўдзіва вобраз вялікага чалавека, які памёр сто гадоў таму. Прызнаем сябе пераможанымі і звернемся хутчэй да яго творчасці.», — так пісаў Уладзімір Набокаў у сваім эсэ «Пушкін, ці Праўда і праўдападабенства».

Імкненне Набокава размежаваць, адрозніць праўду ад праўдападабенства ў асобе нацыянальнага генія пераклікаецца з вострым, рэзкім асабістым пратэстам Г. Гесэ супраць «кумірызацыі» вялікіх, або бессмяротных, як ён называе іх у сваім рамане «Стэпавы воўк», напісаным у 1927-м — якраз у тым годзе, калі Янка Купала канчаткова пасяліўся ў Мінску ў статусе маладога, але ўжо цалкам класіка нацыянальнай літаратуры. У сваім знакамітым рамане Гесэ бязлітасны да спробаў прыручыць наравісты, нязручны, па-сапраўднаму свабодны — і тым небяспечны! — дух генія: «…Карцінка гэтая, бадай што, была не дурнейшая за ўсе карцінкі такога кшталту, за ўсіх гэтых мілых збаўцаў, апосталаў, герояў, тытанаў духу і дзяржаўных мужоў, што ствараюць дбайныя рамеснікі; яна зачапіла мяне, верагодна, пэўнай віртуознасцю майстэрства; як бы там ні было, ганарыстая, самазадаволеная выява старога Гётэ адразу ж разанула мяне агідным дысанансам — а я быў ужо досыць раздражнёны і разхлябаны — і паказала мне, што я патрапіў не туды. Тут былі на месцы прыгожа стылізаваныя заснавальнікі і нацыянальныя славутасці, а не стэпавыя ваўкі».

Матэрыялы дадзенага альбома-каталога, сістэматызаваныя, пракаментаваныя, структураваныя па храналогіі і тыпалогіі, даюць магчымасць праз вобразныя інтэрпрэтацыі аблічча Янкі Купалы, зробленыя некалькімі пакаленнямі мастакоў і сабраныя ў музеі, здзейсніць тую ўнутраную працу, якую здзяйсняе кожны homo culturae, сустракаючыся са сваім нацыянальным геніем літаральна твар у твар. Музей Купалы падрыхтаваў для гэтага працэсу акадэмічна выверaную глебу. Выданне альбома-каталога спрыяе таму, каб выкарыстоўваць калекцыю музея ў больш шырокім плане і больш шырокімі коламі грамадскасці. Музей сваю справу зрабіў. Зараз справа за тымі, хто зможа гэта выкарыстаць, развіць далей, таму што купаліяна працягнецца да таго часу, пакуль будзе жыць сама культура.

Таццяна Бембель,
мастацтвазнаўца, гісторык мастацтва,
член Саюза мастакоў Рэспублікі Беларусь,
Саюза дызайнераў Рэспублікі Беларусь,
Саюза кінематаграфістаў Рэспублікі Беларусь,
старшыня Беларускага аддзялення Міжнароднай рады музеяў ICOM

## Біяграфічныя звесткі мастакоў

**Агафоненка Анатоль Арцёмавіч** (1924, г. Рэчыца, Гомельская вобл., Беларусь, — 1990). Працаваў у сцэнаграфіі, мастацкай рэкламе, станковым жывапісе. Удзельнік мастацкіх выставак з 1964 г. Член Беларускага саюза мастакоў (1966). Творы захоўваюцца ў Нацыянальным мастацкім музеі Рэспублікі Беларусь (Мінск), фондзе Беларускага саюза мастакоў (Мінск).

**Агуновіч Эдуард Канстанцінавіч** (1938, г. Рэчыца, Гомельская вобл., Беларусь). Заслужаны работнік культуры Беларусі (1977). Лаўрэат Дзяржаўнай прэміі Беларусі (1992). Працуе ў станковай і кніжнай графіцы, скульптуры, у галіне мастацтва экспазіцыі музея. Удзельнік мастацкіх выставак з 1966 г. Член Беларускага саюза мастакоў (1971). Творы захоўваюцца ў Нацыянальным мастацкім музеі Рэспублікі Беларусь (Мінск), Нацыянальным гістарычным (Мінск) і іншых музеях Рэспублікі Беларусь, Музеі славянскай бібліятэкі ў Празе (Чэхія), музеі «Графіка мадэрн» у Берліне (Германія).

**Александровіч Анатоль Вячаслававіч** (1953, г. Дзяржынск, Мінская вобл., Беларусь, — 2017). Працаваў у станковай і кніжнай графіцы. Удзельнік мастацкіх выставак з 1982 г. Член Беларускага саюза мастакоў (1989). Творы захоўваюцца ў Нацыянальным мастацкім музеі Рэспублікі Беларусь (Мінск), Музеі сучаснага выяўленчага мастацтва (Мінск).

**Александровіч Віктар Францавіч** (1951, в. Слабодка, Гродзенская вобл., Беларусь). Дыпламант усесаюзных і рэспубліканскіх конкурсаў кнігі. Працуе ў станковай, кніжнай і часопіснай графіцы. Удзельнік мастацкіх выставак з 1975 г. Член Беларускага саюза мастакоў (1985). Аформіў і праілюстраваў звыш 30 выданняў.

**Андруховіч Сцяпан Адамавіч** (1908, в. Губіна, Мінская губ., Расійская імперыя, — 1989). Працаваў у станковым жывапісе ў жанрах пейзажа, партрэта, шматфігурнай карціны. Удзельнік мастацкіх выставак з 1935 г. Член Беларускага саюза мастакоў (1949). Творы захоўваюцца ў Нацыянальным мастацкім музеі Рэспублікі Беларусь (Мінск), фондзе Беларускага саюза мастакоў (Мінск).

**Анікейчык Анатоль Аляксандравіч** (1932, г. Барысаў, Мінская вобл., Беларусь, — 1989). Народны мастак Беларусі (1972), прафесар (1981). Лаўрэат Дзяржаўнай прэміі Беларусі (1974). Працаваў у манументальнай і станковай скульптуры. Удзельнік мастацкіх выставак з 1959 г. Член Беларускага саюза мастакоў (1962). Аўтар помнікаў Я. Купалу ў Мінску, Ляўках (Віцебская вобл.), Араў-парку ў Нью-Йорку (ЗША). Творы захоўваюцца ў Нацыянальным мастацкім музеі Рэспублікі Беларусь (Мінск), Музеі сучаснага выяўленчага мастацтва (Мінск), фондзе Беларускага саюза мастакоў (Мінск), выставачным аб'яднанні «Цэнтральны Дом мастака» (Масква, Расія).

**Ао Тэ** (1969, Кітай). Узнагароджаны Ганаровай граматай Міністэрства культуры Рэспублікі Беларусь (2014). Мае прызы і ўзнагароды міжнароднага ўзроўню. Мастак першай катэгорыі. Член пастаяннага камітэта Асацыяцыі культурных абменаў Кітая і рэдкалегіі часопіса «Искусство Китая». Неаднаразова ўдзельнічаў у выстаўках у Кітаі, Японіі, Францыі, ЗША, Канадзе, Даніі і іншых краінах. Аўтар партрэтаў Я. Купалы і Я. Коласа. Творы захоўваюцца ў будынку парламента — Доме народных сходаў Кітая (Пекін), будынку ўрада ў квартале Чжуннаньхай (Пекін, Кітай), дзяржаўнай рэзідэнцыі Дзяоюйтай (Пекін, Кітай).

**Апіёк Мікалай Апанасавіч** (1935, в. Макараўка, Віцебская вобл., Беларусь). Заслужаны дзеяч мастацтваў Рэспублікі Беларусь (2002). Лаўрэат Спецыяльнай прэміі Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь (2007). Узнагароджаны ордэнам Францыска Скарыны (2011). Працуе ў станковым жывапісе (пейзаж, партрэт, фігуратыўная карціна, нацюрморт), а таксама ў станковай графіцы і сцэнаграфіі. Удзельнік мастацкіх выставак з 1966 г. Член Беларускага саюза мастакоў (1968). Творы захоўваюцца ў Нацыянальным мастацкім музеі Рэспублікі Беларусь (Мінск), Музеі сучаснага выяўленчага мастацтва (Мінск), Дзяржаўным музеі гісторыі беларускай літаратуры (Мінск), фондзе Беларускага саюза мастакоў (Мінск).

**Ахрэмчык Іван Восіпавіч** (1903, г. Мінск, Расійская імперыя, — 1971). Народны мастак Беларусі (1949), прафесар (1964). Працаваў у станковым жывапісе ў жанрах тэматычнай карціны, партрэта, пейзажа, нацюрморта, а таксама ў галіне манументальна-дэкаратыўнага мастацтва. Удзельнік мастацкіх выставак з 1921 г. Член Беларускага саюза мастакоў (1940). Стварыў шэраг партрэтаў дзеячаў беларускай літаратуры і культуры — Ю. Пэна, К. Чорнага, П. Глебкі, У. Галубка, Е. Міровіча. Асабіста ведаў Я. Купалу. У 1945 г. па заказе У.Ф. Луцэвіч (жонкі паэта і першага дырэктара літаратурнага музея Янкі Купалы) стварыў адзін з лепшых партрэтаў паэта, які ў 1949 г. быў перададзены ў мастацкую калекцыю музея. Творы захоўваюцца ў Нацыянальным мастацкім музеі Рэспублікі Беларусь (Мінск), Беларускім дзяржаўным музеі гісторыі Вялікай Айчыннай вайны (Мінск), Астраханскай дзяржаўнай карціннай галерэі імя П.М. Дагадзіна (Расія).

**Бараноўская Галіна Мікалаеўна** (1936, г. Іркуцк, Расія). Працуе ў тэхніцы акварэльнага жывапісу. Удзельніца мастацкіх выставак з 1989 г. Член Беларускага Саюза мастакоў (1993). Асноўныя творы — серыі, прысвечаныя архітэктурным помнікам.

**Барздыка Міхаіл Фёдаравіч** (1944, в. Шклянцы, Віцебская вобл., Беларусь). Узнагароджаны сярэбраным медалём Еўрапейскай акадэміі мастацтваў на XXII міжнародным салоне графікі ў Бельгіі (1992), залатым медалём на міжнародным конкурсе графікі ў Валоніі, Бельгія (1993). Працуе ў станковай і кніжнай графіцы. Удзельнік мастацкіх выставак з 1976 г. Член Беларускага саюза мастакоў (1990). Творы захоўваюцца ў Нацыянальным мастацкім музеі Рэспублікі Беларусь (Мінск), Дзяржаўным Рускім музеі (Санкт-Пецярбург, Расія), пінакатэцы Рыпэ Сан Жынэзіа (Італія), Музеі сучаснага мастацтва «Шамальер» (Францыя), Гарадскім музеі выяўленчых мастацтваў г. Дзьёр (Венгрыя).

**Бархаткоў Антон Стэфанавіч** (1917, в. Шчаглоўка, Магілёўская губ., Расійская імперыя, — 2001). Заслужаны дзеяч мастацтваў Беларусі (1991). Працаваў у жанрах пейзажа і тэматычнай карціны. Член Беларускага саюза мастакоў (1957). Пасля вызвалення Беларусі прымаў удзел у арганізацыі і правядзенні



першай выстаўкі мастацтва Беларусі ў Маскве, прысвечанай 25-годдзю ўтварэння БССР. Творы захоўваюцца ў Нацыянальным мастацкім музеі Рэспублікі Беларусь (Мінск), Музеі сучаснага выяўленчага мастацтва (Мінск); музеях Магілёва, Гомеля, Бялынічаў, Касцюковічаў; Дзяржаўнай Траццякоўскай галерэі (Масква, Расія), Цвярской мастацкай галерэі (Расія), а таксама прыватных калекцыях Бельгіі, Галандыі і іншых краін.

**Бархаткоў Ігар Антонавіч** (1958, г. Мінск, Беларусь). Лаўрэат Спецыяльнай прэміі Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь (2010). Працуе ў жанрах пейзажа і тэматычнай карціны. Удзельнік мастацкіх выставак з 1976 г. Член Беларускага саюза мастакоў (1988). Персанальныя выстаўкі праходзілі ў Італіі, Галандыі, Літве, Расіі. Творы захоўваюцца ў Нацыянальным мастацкім музеі Рэспублікі Беларусь (Мінск), Музеі сучаснага выяўленчага мастацтва (Мінск), музеі Беларускага Палесся (Пінск), Цэнтральным музеі Вялікай Айчыннай вайны на Паклоннай гары (Масква, Расія), фондзе Беларускага саюза мастакоў (Мінск); прыватных зборах Беларусі, Расіі, Канады, Германіі, ЗША, Ізраіля.

**Басалыга Міхаіл Самуілавіч** (1942, г. Слуцк, Беларусь). Узнагароджаны рэспубліканскімі і замежнымі дыпломамі і граматамі за мастацкае афармленне кніг, сярэбраным медалём ВДНГ СССР (1985). Працуе ў кніжнай і станковай графіцы. Удзельнік мастацкіх выставак з 1963 г. Член Беларускага саюза мастакоў (1971). Стварыў шэраг кніжных ілюстрацый паводле твораў беларускіх пісьменнікаў — Я. Коласа, П. Броўкі, М. Танка, Г. Бураўкіна, А. Петрашкевіча. Творы захоўваюцца ў Нацыянальным мастацкім музеі Рэспублікі Беларусь (Мінск), Музеі сучаснага выяўленчага мастацтва (Мінск), Дзяржаўным музеі гісторыі беларускай літаратуры (Мінск), Магілёўскім абласным мастацкім музеі імя П.В. Масленікава, Дзяржаўнай Траццякоўскай галерэі (Масква, Расія), фондзе Беларускага саюза мастакоў (Мінск), прыватных зборах замежжа.

**Басалыга Уладзімір Самойлавіч** (1940, г. Слуцк, Беларусь). Узнагароджаны медалём Францыска Скарыны (1990), бронзавым медалём ВДНГ СССР (1968), граматамі і дыпломамі рэспубліканскіх і ўсесаюзных конкурсаў за мастацкае афармленне кнігі. Працуе ў станковай і кніжнай графіцы. Удзельнік мастацкіх выставак з 1963 г. Член Беларускага саюза мастакоў (1971). Стварыў шэраг кніжных ілюстрацый паводле твораў беларускіх пісьменнікаў — Я. Коласа, П. Броўкі, М. Танка, У. Караткевіча. Творы захоўваюцца ў Нацыянальным мастацкім музеі Рэспублікі Беларусь (Мінск), Музеі сучаснага выяўленчага мастацтва (Мінск), Дзяржаўным музеі гісторыі беларускай літаратуры (Мінск), Слуцкім краязнаўчым музеі (Мінская вобл.), Гродзенскім дзяржаўным гісторыка-археалагічным музеі, Дзяржаўным музеі гісторыі рэлігіі (Санкт-Пецярбург, Расія), фондзе Беларускага саюза мастакоў (Мінск).

**Белановіч Іосіф Іосіфавіч** (1929, г. Мінск, Беларусь, — 1998). Працаваў у жанрах фігуратыўнай карціны, партрэта, а таксама ў графіцы. Удзельнік мастацкіх выставак з 1949 г. Член Беларускага саюза мастакоў (1964). Творы захоўваюцца ў Нацыянальным мастацкім музеі Рэспублікі Беларусь (Мінск), Беларускім дзяржаўным музеі гісторыі Вялікай Айчыннай вайны (Мінск), Музеі сучаснага выяўленчага мастацтва (Мінск), Музеі Беларускага Палесся (Пінск), Брэсцкім краязнаўчым музеі.

**Бельскі Міхаіл Лявонцьевіч** (1921, г. Сянно, Віцебская вобл., Беларусь, — 1988). Працаваў у галіне станковай і кніжнай графікі. Удзельнік мастацкіх выставак з 1947 г. Член Беларускага саюза мастакоў (1954). Творы захоўваюцца ў Нацыянальным мастацкім музеі Рэспублікі Беларусь (Мінск), фондзе Беларускага саюза мастакоў (Мінск).

**Белагураў Эдуард Аляксеевіч** (1947, г. Бабруйск, Беларусь, — 1998). Працаваў у жанрах партрэта і фігуратыўнай карціны. Удзельнік мастацкіх выставак з 1975 г. Член Беларускага саюза мастакоў (1977). Творы захоўваюцца ў Нацыянальным мастацкім музеі Рэспублікі Беларусь (Мінск), Музеі сучаснага выяўленчага мастацтва (Мінск), фондзе Беларускага саюза мастакоў (Мінск), Дзяржаўным музейна-выставачным цэнтры Міністэрства культуры Расіі (Масква).

**Беляніцкі Мацвей Захаравіч** (1909, г. Магілёў, Расійская імперыя, — 1990). Працаваў у жанрах фігуратыўнай карціны, пейзажа, партрэта і нацюрморта. Удзельнік мастацкіх выставак з 1927 г. Член Беларускага саюза мастакоў (1946). Творы захоўваюцца ў Нацыянальным мастацкім музеі Рэспублікі Беларусь (Мінск), Бабруйскім краязнаўчым музеі (Магілёўская вобл.), Гродзенскім гісторыка-археалагічным музеі, фондзе Беларускага саюза мастакоў (Мінск).

**Бембель Андрэй Ануфрыевіч** (1905, г. Веліж, Віцебская губ., Расійская імперыя, — 1986). Заслужаны дзеяч мастацтваў БССР, народны мастак Беларусі (1955), прафесар (1962). Лаўрэат Дзяржаўнай прэміі Беларусі (1970). Узнагароджаны сярэбраным медалём імя М. Грэкава (1972). Працаваў у манументальнай і станковай скульптуры. Удзельнік мастацкіх выставак з 1927 г. Член Беларускага саюза мастакоў (1940). Стваральнік (у сааўтарстве) Кургана Славы Савецкай Арміі (Мінская вобл.), мемарыяльнага комплекса «Брэсцская крэпасць-герой», манументальных фрызаў-барэльефаў для Дома ўрада, рэльефа «9 мая 1945 года» для манумента Перамогі на плошчы Перамогі ў Мінску. Творы захоўваюцца ў Нацыянальным мастацкім музеі Рэспублікі Беларусь (Мінск), Музеі сучаснага выяўленчага мастацтва (Мінск), Беларускім дзяржаўным музеі гісторыі Вялікай Айчыннай вайны (Мінск), Нацыянальным музеі мастацтва Румыніі (Бухарэст).

**Бразер Абрам Маркавіч** (1892, г. Кішынёў, Бесарабская губ., Расійская імперыя, — 1942). Заслужаны дзеяч мастацтваў БССР (1940). Працаваў у манументальнай і станковай скульптуры, розных жанрах жывапісу, у графіцы. Член Беларускага саюза мастакоў (1940). Сярод адметных графічных работ — партрэты Я. Купалы, Я. Коласа, М. Лынькова, К. Чорнага, П. Броўкі. Творы захоўваюцца ў Нацыянальным мастацкім музеі Рэспублікі Беларусь (Мінск).

**Бржазоўскі Генрых Францавіч** (1912, г. Мінск, Расійская імперыя, — 2008). Творы мастака адзначаны прэміяй міжнароднага фонду «Дзецям Чарнобыля» (1996). Працаваў у жанрах фігуратыўнай карціны, пейзажа, нацюрморта. Удзельнік мастацкіх выставак з 1937 г. Член Беларускага саюза мастакоў (1945). Удзельнік першага з'езда мастакоў Беларусі (1938). Творы захоўваюцца ў Нацыянальным мастацкім музеі

Рэспубліні Беларусь (Мінск), Музеі сучаснага выяўленчага мастацтва (Мінск), Беларускім дзяржаўным музеі Вялікай Айчыннай вайны (Мінск), Магілёўскім абласным мастацкім музеі імя П.В. Масленікава, Віцебскім абласным краязнаўчым музеі і іншых музеях Беларусі, фондзе Беларускага саюза мастакоў (Мінск), Дзяржаўным музейна-выставачным цэнтры Міністэрства культуры Расіі (Масква), а таксама ў музеях Масквы, Германіі, Італіі, прыватных калекцыях Бельгіі, Галандыі, Польшчы, Англіі, Японіі, ЗША, Ізраіля.

**Віткоўскі Рыгор Антонавіч** (1923, г. Мінск, Беларусь, — 1992). Працаваў у станковай і кніжнай графіцы (афорт, літаграфія, аловак, сангіна), а таксама ў тэхніцы акварэлі. Удзельнік мастацкіх выставак з 1959 г. Член Беларускага саюза мастакоў (1965). Творы захоўваюцца ў Нацыянальным мастацкім музеі Рэспублікі Беларусь (Мінск), фондзе Беларускага саюза мастакоў (Мінск), мастацкім музеі г. Веніс (Францыя).

**Волкаў Анатоль Валянцінавіч** (1908, г. Пенза, Расійская імперыя, — 1985). Працаваў у кніжнай і станковай графіцы, у жанры сатыры (карыкатура, плакат). Удзельнік мастацкіх выставак з 1925 г. Член Беларускага саюза мастакоў (1945). У гады Вялікай Айчыннай вайны — супрацоўнік сатырычнага выдання «Раздавім фашысцкую гадзіну». Творы захоўваюцца ў Нацыянальным мастацкім музеі Рэспублікі Беларусь (Мінск), Музеі сучаснага выяўленчага мастацтва (Мінск), Дзяржаўным музеі гісторыі беларускай літаратуры (Мінск).

**Волкаў Валянцін Віктаравіч** (1881, г. Ялец, Арлоўская губ., Расійская імперыя, — 1964). Народны мастак Беларусі (1955), прафесар (1961). Працаваў у жанрах тэматычнай карціны, партрэта, пейзажа, нацюрморта. Удзельнік мастацкіх выставак з 1903 г. Член Саюза мастакоў БССР (1940). Ілюстраваў і афармляў кнігі беларускіх пісьменнікаў. Аўтар малюнка герба БССР (1926 і 1938). Творы захоўваюцца ў Нацыянальным мастацкім музеі Рэспублікі Беларусь (Мінск), Музеі сучаснага выяўленчага мастацтва (Мінск), фондзе Беларускага саюза мастакоў (Мінск).

**Высоцкі Аляксей Барысавіч** (1948, в. Паўловічы, Віцебская вобл., Беларусь). Працуе ў станковым жывапісе, пераважна ў жанры пейзажа. Удзельнік мастацкіх выставак з 1976 г. Член Беларускага саюза мастакоў (1990).

**Гарачаў Станіслаў Якаўлевіч** (1938, г. Гарадзец, Ніжагародская вобл., Расія, — 1997). Працаваў у жанры партрэта, пейзажа і фігуратыўнай карціны. Удзельнік мастацкіх выставак з 1962 г. Член Беларускага саюза мастакоў (1967). Творы захоўваюцца ў Нацыянальным мастацкім музеі Рэспублікі Беларусь (Мінск), фондзе Беларускага саюза мастакоў (Мінск).

**Гемедзінаў** (няма звестак)

**Герус Сямён Пятровіч** (1925, в. Кунічна, Гродзенская вобл., Беларусь, — 1998). Працаваў у станковай графіцы. Удзельнік мастацкіх выставак з 1953 г. Член Беларускага саюза мастакоў (1956). Творы захоўваюцца ў Нацыянальным мастацкім музеі Рэспублікі Беларусь (Мінск), Музеі сучаснага выяўленчага мастацтва (Мінск), Беларускім дзяржаўным музеі гісторыі Вялікай Айчыннай вайны (Мінск), Гродзенскім дзяржаўным гісторыка-археалагічным музеі; Навагрудскім, Дзятлаўскім, Пінскім і Салігорскім краязнаўчых музеях; Дзяржаўным літаратурна-мемарыяльным доме-музеі Якуба Коласа (Мінск), Літаратурным музеі Максіма Багдановіча (Мінск), фондзе Беларускага саюза мастакоў (Мінск).

**Глебаў Аляксей Канстанцінавіч** (1908, в. Зверавічы, Смаленская губ., Расійская імперыя, — 1968). Заслужаны дзеяч мастацтваў Беларусі (1944), народны мастак Беларусі (1955). Лаўрэат Дзяржаўнай прэміі Беларусі (1976). Працаваў у галіне станковай і манументальнай пластыкі. Удзельнік мастацкіх выставак з 1956 г. Член Беларускага саюза мастакоў (1957). Творы захоўваюцца ў Нацыянальным мастацкім музеі Рэспублікі Беларусь (Мінск), фондзе Беларускага саюза мастакоў (Мінск), Музеі сучаснага выяўленчага мастацтва (Мінск).

**Грамыка Віктар Аляксандравіч** (1923, в. Сянькова, Магілёўская вобл., Беларусь). Ганаровы член Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі (1970), заслужаны дзеяч мастацтваў Беларусі (1970), народны мастак Беларусі (1991). Лаўрэат Спецыяльнай прэміі Прэзідэнта ў галіне літаратуры і мастацтва (1998), лаўрэат прэміі Расійскай акадэміі мастацтва. Узнагароджаны залатым медалём ВДНГ СССР, сярэбраным медалём імя Грэкава (1978), ордэнам Францыска Скарыны (2013), ордэнам Айчыны III ст. (2003), медалём Францыска Скарыны (1996), дыпломамі Акадэміі мастацтваў СССР. Працуе ў станковым жывапісе ў жанрах тэматычнай карціны, пейзажа, партрэта. Удзельнік мастацкіх выставак з 1947 г. Член Беларускага саюза мастакоў (1959). Творы захоўваюцца ў Нацыянальным мастацкім музеі Рэспублікі Беларусь (Мінск), Музеі сучаснага выяўленчага мастацтва (Мінск), Магілёўскім абласным мастацкім музеі імя П.В. Масленікава, фондзе Беларускага саюза мастакоў (Мінск), Дзяржаўнай Траццякоўскай галерэі (Масква, Расія), Дзяржаўным гісторыка-культурным музеі-запаведніку «Маскоўскі Крэмль» (Расія).

**Грамыка Рыгор Пятровіч** (няма звестак)

**Гумілеўскі Леў Мікалаевіч** (1930, г. Масква, Расія). Заслужаны дзеяч мастацтваў Беларусі (1977), народны мастак Беларусі (1991). Лаўрэат Дзяржаўнай прэміі Беларусі (1974), лаўрэат прэміі Саюзнай дзяржавы ў галіне літаратуры і мастацтва (2010). Узнагароджаны медалём Францыска Скарыны (2001), сярэбраным медалём імя М. Грэкава (1983). Працуе ў манументальнай і станковай скульптуры. Удзельнік мастацкіх выставак з 1958 г. Член Беларускага саюза мастакоў (1964). Аўтар помніка Я. Купалу ў Маскве (Расія). Творы захоўваюцца ў Нацыянальным мастацкім музеі Рэспублікі Беларусь (Мінск), Магілёўскім абласным мастацкім музеі імя П.В. Масленікава, фондзе Беларускага саюза мастакоў (Мінск), Гродзенскім дзяржаўным гісторыка-археалагічным музеі, Мікалаеўскім мастацкім музеі імя В.В. Верашчагіна (Украіна).

**Гумілеўскі Сяргей Львовіч** (1963, г. Мінск, Беларусь). Лаўрэат прэміі Саюзнай дзяржавы ў галіне літаратуры і мастацтва (2010). Працуе ў манументальнай і станковай скульптуры. Удзельнік мастацкіх выставак з 1983 г. Член Беларускага саюза мастакоў (1990). Творы захоўваюцца ў Нацыянальным мастацкім музеі Рэспублікі Беларусь (Мінск), Музеі сучаснага выяўленчага мастацтва (Мінск), Дзяржаўным музеі гісторыі беларускай літаратуры (Мінск).



**Гусеў Мікалай Іванавіч** (1899, в. Метліна, Уладзімірская губ., Расійская імперыя, — 1965). Працаваў у жанрах карціны, партрэта, у графіцы. Удзельнік мастацкіх выставак з 1925 г. Член Беларускага саюза мастакоў (1940). Стварыў серыю партрэтаў дзеячаў беларускай літаратуры і мастацтва: П. Глебкі, А. Бембеля, П. Броўкі, Р. Шырмы, Я. Купалы, І. Харыка. Творы захоўваюцца ў Нацыянальным мастацкім музеі Рэспублікі Беларусь (Мінск), фондзе Беларускага саюза мастакоў (Мінск).

**Давідовіч Ісак Аронавіч** (1911, г. Бабруйск, Расійская імперыя, — 1993). Працаваў у станковым і манументальным жывапісе і графіцы. Удзельнік мастацкіх выставак з 1930 г. Член Беларускага саюза мастакоў (1940). Творы захоўваюцца ў Нацыянальным мастацкім музеі Рэспублікі Беларусь (Мінск), Магілёўскім абласным мастацкім музеі імя П.В. Масленікава, Беларускім дзяржаўным музеі Вялікай Айчыннай вайны (Мінск), Літаратурным музеі Льва Талстога (Масква, Расія), фондзе Беларускага саюза мастакоў (Мінск).

**Давідовіч Сяргей Фёдаравіч** (1942, в. Карпілаўка, Мінская вобл., Беларусь). Узнагароджаны медалём Францыска Скарыны (2017). Працуе ў жанры тэматычнай карціны, пейзажа. Удзельнік мастацкіх выставак з 1990 г. Член Беларускага саюза мастакоў (1995).

**Дударэнка Леанід Аляксандравіч** (1930, г. Маладзечна, Мінская вобл., Беларусь). Заслужаны дзеяч мастацтваў Беларусі (1991). Лаўрэат Спецыяльнай прэміі Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь у галіне літаратуры і мастацтва (2000). Узнагароджаны медалём Францыска Скарыны (2013). Працуе ў розных жанрах станковага жывапісу. Удзельнік мастацкіх выставак з 1962 г. Член Беларускага саюза мастакоў (1967). Творы захоўваюцца ў Нацыянальным мастацкім музеі Рэспублікі Беларусь (Мінск), Музеі сучаснага выяўленчага мастацтва (Мінск), Магілёўскім абласным мастацкім музеі імя П.В. Масленікава, фондзе Беларускага саюза мастакоў (Мінск), Астраханскай дзяржаўнай карціннай галерэі імя П.М. Дагадзіна (Расія), Дзяржаўным музейна-выставачным цэнтры Міністэрства культуры Расіі (Масква).

**Елісееў Канстанцін Сцяпанавіч** (1890, г. Санкт-Пецярбург, Расійская імперыя, — 1968). Заслужаны дзеяч мастацтваў РСФСР (1945). Працаваў у графіцы. Мастак тэатра і кіно. Член Саюза мастакоў СССР. Аўтар сатырычнай графікі, палітычных плакатаў і часопісных карыкатур. Персанальныя выстаўкі праходзілі ў Мінску (1952), Маскве (1948, 1951, 1968) і Яраслаўлі (1954); творы экспанаваліся на замежных выстаўках у Харватыі (Загрэб, 1973) і іншых краінах. Сябраваў з Я. Купалам і У. Маякоўскім. У пачатку 20-х гг. XX ст. афармляў спектаклі ў Першым Беларускім драматычным тэатры, у т.л. «Сон на кургане» Я. Купалы. Творы захоўваюцца ў многіх рэгіянальных музеях Расіі, а таксама ў прыватных калекцыях Расіі і за мяжой.

**Еўтухоў Уладзімір Аляксеевіч** (1948, пас. Вішанскі, Гомельская вобл., Беларусь). Працуе ў манументальна-дэкаратыўным і станковым жывапісе. Удзельнік мастацкіх выставак з 1975 г. Член Беларускага саюза мастакоў (1988). Творы захоўваюцца ў фондзе Беларускага саюза мастакоў (Мінск), Дзяржаўнай гісторыка-культурнай установе «Гомельскі палацава-паркавы ансамбль».

**Збораў Абрам Барысавіч** (1911, м. Лёзна, Віцебская губ., Расійская імперыя, — 1985). Працаваў у станковым жывапісе. Удзельнік мастацкіх выставак з 1939 г. Член Саюза мастакоў СССР. Творы захоўваюцца ў Нацыянальным мастацкім музеі Рэспублікі Беларусь (Мінск), а таксама ў зборах іншых музеяў Беларусі і Ізраіля.

**Збораў Барыс Абрамавіч** (1935, г. Мінск, Беларусь). Ганаровы акадэмік Расійскай акадэміі мастацтваў. Узнагароджаны ордэнам «Мастацтва і літаратура» (Францыя). Жывапісец, графік, скульптар, тэатральны мастак. Персанальныя выстаўкі праходзілі ў Мінску, Маскве, Санкт-Пецярбургу, Парыжы, Нью-Йорку, Токіа, Фларэнцыі. Творы захоўваюцца ў Нацыянальным мастацкім музеі Рэспублікі Беларусь (Мінск), Музеі сучаснага выяўленчага мастацтва (Мінск), фондзе Беларускага саюза мастакоў (Мінск), Дзяржаўнай Траццякоўскай галерэі (Масква, Расія), Дзяржаўным Рускім музеі (Санкт-Пецярбург, Расія), Галерэі Уфіцы (Фларэнцыя, Італія).

**Зайцаў Анатоль Цімафеевіч** (1939, в. Гарадок, Смаленская вобл., Расія — 2009). Працаваў у станковай і кніжнай графіцы. Удзельнік мастацкіх выставак з 1964 г. Член Беларускага саюза мастакоў (1970).

**Зайцаў Юрый Канстанцінавіч** (1937, г. Барнаул, Расія). Узнагароджаны дыпломамі міжнародных конкурсаў у Браціславе, Кракаве, Любліне. Працуе ў станковай і кніжнай графіцы, а таксама ў акварэлі і жывапісе. Удзельнік мастацкіх выставак з 1962 г. Член Беларускага саюза мастакоў (1969). Творы захоўваюцца ў Нацыянальным мастацкім музеі Рэспублікі Беларусь (Мінск), фондзе Беларускага саюза мастакоў (Мінск), Дзяржаўнай Траццякоўскай галерэі (Масква, Расія), галерэі «Пітэр Людвіг» (Кёльн, Германія), «Zimmerli Art Museum» (штат Нью-Джэрсі, ЗША).

**Зайцаў Яўген Аляксеевіч** (1907, г. Невель, Віцебская губ., Расійская імперыя, — 1992). Народны мастак Беларусі (1963), член-карэспандэнт Акадэміі мастацтваў СССР (1973). Працаваў у станковым жывапісе ў жанры сюжэтна-тэматычнай карціны. Удзельнік мастацкіх выставак з 1935 г. Член Беларускага саюза мастакоў (1940).

**Ізмайлаў Мікалай Аляксандравіч** (няма звестак)

**Ілюхін Уладзімір Андрэеевіч** (1912—1991)

**Казлоўскі Валерый Пятровіч** (1956, г. Дуброўна, Віцебская вобл., Беларусь). Працуе ў манументальнай і станковай скульптуры. Удзельнік мастацкіх выставак з 1982 г. Творы захоўваюцца ў музеях, галерэях і прыватных калекцыях.

**Кашкурэвіч Арлен Міхайлавіч** (1929, г. Мінск, Беларусь, — 2014). Заслужаны дзеяч мастацтваў Беларусі (1973), народны мастак Беларусі (1991), прафесар (1995). Лаўрэат Дзяржаўнай прэміі Беларусі (1972). Узнагароджаны шматлікімі дыпломамі і прэміямі за лепшае афармленне кніг. Працаваў у станковай і кніжнай графіцы. Удзельнік мастацкіх выставак з 1959 г. Член Беларускага саюза мастакоў (1960). Аўтар серый ілюстрацый паводле твораў Я. Купалы, І. Шамякіна, У. Караткевіча, М. Гусоўскага, А. Адамовіча, К. Чорнага. Творы захоўваюцца ў Нацыянальным мастацкім музеі Рэспублікі Беларусь (Мінск), Нацыянальным гістарычным музеі Рэспублікі Беларусь (Мінск), Музеі сучаснага выяўленчага мастацтва (Мінск), Дзяржаўнай Траццякоўскай галерэі (Масква, Расія), Музеі сучаснага мастацтва (Скоп’е, Македонія), Доме-музеі Іагана Вольфганга Гётэ і Доме-музеі Фрыдрыха Шылера (Веймар, Германія), фондзе Беларускага саюза мастакоў (Мінск), Дзяржаўным музейна-выставачным цэнтры Міністэрства культуры Расіі (Масква), музейных зборах Полацка, Гродна, Кіева (Украіна), прыватных калекцыях.

**Красільнікаў Дмітрый Мікалаевіч** (1903, в. Сярэднія Пінячы, Татарастан, Расійская імперыя — 1951). Працаваў у сатырычнай і кніжнай графіцы. Удзельнік мастацкіх выставак з 1933 г. У гады Вялікай Айчыннай вайны працаваў у беларускім сатырычным выданні «Раздавім фашысцкую гадзіну».

**Красіцкі Фоцій Сцяпанавіч** (1873, с. Зялёная Дубрава, Кіеўская губ., Расійская імперыя, — 1944). Народны мастак Украіны. Аўтар жанравых карцін і пейзажаў, графік. Стваральнік серыі партрэтаў выбітных дзеячаў Украіны М. Старыцкага, Л. Украінкі, І. Франко, Т. Шаўчэнкі. Адметнай падзеяй у жыцці мастака стаў удзел у мастацкай выстаўцы ў Львове (1905).

**Красоўскі Яўген Яўстафіевіч** (1908, г. Баку, Расійская імперыя, — 1980). Заслужаны работнік культуры Беларусі (1975). Жывапісец. Удзельнік мастацкіх выставак з 1933 г. Член Беларускага саюза мастакоў (1940). Творы захоўваюцца ў Нацыянальным мастацкім музеі Рэспублікі Беларусь (Мінск), Музеі сучаснага выяўленчага мастацтва (Мінск), фондзе Беларускага саюза мастакоў (Мінск).

**Кроль Абрам Іосіфавіч** (1913, г. Койданава, Расійская імперыя, — 1990). Працаваў у жанрах фігуратыўнай карціны і пейзажа. Удзельнік мастацкіх выставак з 1932 г. Член Беларускага саюза мастакоў (1946). Творы захоўваюцца ў Нацыянальным мастацкім музеі Рэспублікі Беларусь (Мінск), Музеі сучаснага выяўленчага мастацтва (Мінск), Беларускім дзяржаўным музеі гісторыі Вялікай Айчыннай вайны (Мінск), фондзе Беларускага саюза мастакоў (Мінск).

**Кругер Якаў Маркавіч** (Янкель Мордухавіч; 1869, г. Мінск, Расійская імперыя, — 1940). Заслужаны дзеяч мастацтваў Беларусі (1939). Жывапісец, педагог. Удзельнік парыжскіх выставак (1888—1895). Вучыўся ў У.Я. Макоўскага ў Пецярбургскай акадэміі мастацтваў (1897—1900). Адкрыў у Мінску мастацкую студыю (1904). Яго вучнямі былі І. Ахрэмчык, З. Азгур, Х. Суцін, М. Кікоін, М. Станюта. Член Усебеларускага аб’яднання мастакоў (1927). Аўтар партрэтаў пісьменнікаў, паэтаў, навуковых і грамадскіх дзеячаў Беларусі. Асабіста ведаў Я. Купалу. Творы захоўваюцца ў Нацыянальным мастацкім музеі Рэспублікі Беларусь (Мінск).

**Ксяндзоў Аляксандр Паўлавіч** (1954, в. Баравая, Мінская вобл., Беларусь). Узнагароджаны Гран-пры Міжнароднага пленэра імя Марка Шагала (1997) і медалём Францыска Скарыны (2007). Працуе ў жанры фігуратыўнай карціны. Удзельнік мастацкіх выставак з 1975 г. Член Беларускага саюза мастакоў (1983). Творы захоўваюцца ў Нацыянальным мастацкім музеі Рэспублікі Беларусь (Мінск), Музеі сучаснага выяўленчага мастацтва (Мінск), фондзе Беларускага саюза мастакоў (Мінск), Дзяржаўнай Траццякоўскай галерэі (Масква, Расія), Дзяржаўным музейна-выставачным цэнтры Міністэрства культуры Расіі (Масква).

**Кулік Яўген Сяргеевіч** (1937, г. Мінск, Беларусь, — 2002). Шматразова адзначаны дыпломамі айчынных і замежных конкурсаў кніжнай графікі, у т.л. дыпломам Францыска Скарыны. Працаваў у кніжнай і станковай графіцы, экслібрысе. Удзельнік мастацкіх выставак з 1963 г. Член Беларускага саюза мастакоў (1965). Творы захоўваюцца ў Нацыянальным мастацкім музеі Рэспублікі Беларусь (Мінск), Нацыянальным гістарычным музеі Рэспублікі Беларусь (Мінск), Музеі сучаснага выяўленчага мастацтва (Мінск), Літаратурным музеі Максіма Багдановіча (Мінск), фондзе Беларускага саюза мастакоў (Мінск), Гісторыка-культурным музеі-запаведніку «Заслаўе».

**Купава Мікалай Мікалаевіч** (1946, г. Орша, Беларусь). Працуе ў станковай і кніжнай графіцы, акварэлі. Удзельнік мастацкіх выставак з 1972 г. Член Беларускага саюза мастакоў (1978). Творы захоўваюцца ў Нацыянальным мастацкім музеі Рэспублікі Беларусь (Мінск), Нацыянальным гістарычным музеі Рэспублікі Беларусь (Мінск), Музеі сучаснага выяўленчага мастацтва (Мінск), Беларускім дзяржаўным музеі гісторыі Вялікай Айчыннай вайны (Мінск), Дзяржаўным літаратурна-мемарыяльным доме-музеі Якуба Коласа (Мінск) і зборах іншых музеяў Беларусі, фондзе Беларускага саюза мастакоў (Мінск).

**Курачкін Акім Рыгоравіч** (1912, г. Ветка, Гомельская вобл., Беларусь, — 2004). Заслужаны работнік культуры Беларусі (1988). Узнагароджаны медалём Францыска Скарыны (1996). Працаваў у станковай і манументальнай скульптуры. Удзельнік мастацкіх выставак з 1940 г. Член Беларускага саюза мастакоў (1956). Творы захоўваюцца ў Нацыянальным мастацкім музеі Рэспублікі Беларусь (Мінск), Нацыянальным гістарычным музеі Рэспублікі Беларусь (Мінск), Беларускім дзяржаўным музеі гісторыі Вялікай Айчыннай вайны (Мінск), мемарыяльным комплексе «Брэсцкая крэпасць-герой», Дзяржаўным літаратурна-мемарыяльным доме-музеі Якуба Коласа (Мінск) і зборах іншых музеяў Беларусі, фондзе Беларускага саюза мастакоў (Мінск).

**Лейтман Леў Маркавіч** (Меераві́ч; 1896, г. Петрыкаў, Расійская імперыя, — 1974). Заслужаны дзеяч мастацтваў Беларусі (1967). Графік. Удзельнік мастацкіх выставак з 1929 г. Член Беларускага саюза мастакоў (1940). Творы захоўваюцца ў Нацыянальным мастацкім музеі Рэспублікі Беларусь (Мінск), Віцебскім абласным мастацкім музеі і зборах іншых музеяў Беларусі, фондзе Беларускага саюза мастакоў (Мінск).

**Ліпень Аляксандр Іванавіч** (1925–2006). Працаваў у станковай і манументальнай скульптуры. Сярод вядомых твораў — партрэты беларускіх пісьменнікаў: Я. Купалы, Ф. Багушэвіча, Я. Коласа, А. Пашкевіч.



**Ліўшыц Хайм Майсеевіч** (1912, г. Віцебск, Расійская імперыя, — 1994). Працаваў у жанрах сюжэтна-тэматычных карцін, псіхалагічнага партрэта, пейзажа і нацюрморта. Педагог, дацэнт кафедры жывапісу Беларускага дзяржаўнага тэатральна-мастацкага інстытута (1968—1979).Удзельнік мастацкіх выставак з 1940 г. Член Саюза мастакоў СССР (1946). Творы захоўваюцца ў Нацыянальным мастацкім музеі Рэспублікі Беларусь (Мінск), Дзяржаўным музеі гісторыі беларускай літаратуры (Мінск), фондзе Беларускага саюза мастакоў (Мінск), прыватных зборах Беларусі і замежжа.

**Лось Алена Георгіеўна** (1933, г. Вільнюс, Польшча, — 2013). Дыпламант міжнародных і рэспубліканскіх конкурсаў кнігі. Узнагароджана медалём Францыска Скарыны (2003). Працавала ў станковай і кніжнай графіцы. Удзельніца мастацкіх выставак з 1956 г. Член Саюза мастакоў СССР (1963). Творы захоўваюцца ў Нацыянальным мастацкім музеі Рэспублікі Беларусь (Мінск), Дзяржаўным музеі гісторыі беларускай літаратуры (Мінск), Дзяржаўным літаратурна-мемарыяльным доме-музеі Якуба Коласа (Мінск), фондзе Беларускага саюза мастакоў (Мінск), Дзяржаўным музейна-выставачным цэнтры Міністэрства культуры Расіі (Масква), Дзяржаўнай Траццякоўскай галерэі (Масква, Расія), Дзяржаўным музеі А.С. Пушкіна (Масква, Расія).

**Лук Павел Іванавіч** (1956, в. Жылічы, Брэсцкая вобл., Беларусь). Працуе ў станковай скульптуры. Удзельнік мастацкіх выставак з 1986 г. Член Беларускага саюза мастакоў (1990). Творы захоўваюцца ў Музеі сучаснага выяўленчага мастацтва (Мінск), Музеі-сядзібе Францішка Багушэвіча «Кушляны» (Гродзенская вобл.), фондзе Беларускага саюза мастакоў (Мінск).

**Лятун Уладзімір Міхайлавіч** (1935, в. Смалінец, Мінская вобл., Беларусь, — 2001). Лаўрэат Дзяржаўнай прэміі Беларусі (1986), лаўрэат Спецыяльнай прэміі Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь у галіне літаратуры і мастацтва (1999). Працаваў у манументальнай і станковай скульптуры. Удзельнік мастацкіх выставак з 1958 г. Член Беларускага саюза мастакоў (1967). Творы захоўваюцца ў Нацыянальным мастацкім музеі Рэспублікі Беларусь (Мінск), Музеі сучаснага выяўленчага мастацтва (Мінск), Магілёўскім абласным мастацкім музеі імя П.В. Масленікава, фондзе Беларускага саюза мастакоў (Мінск), Мазырскай карціннай галерэі (Гомельская вобл.), Музеі Ягелонскага ўніверсітэта (Кракаў, Польшча).

**Макаранка Міхаіл Сяргеевіч** (1931, в. Прусіна, Магілёўская вобл., Беларусь, — 2009). Працаваў у станковай графіцы і акварэлі. Удзельнік мастацкіх выставак з 1963 г. Член Беларускага саюза мастакоў (1968). Творы захоўваюцца ў Нацыянальным мастацкім музеі Рэспублікі Беларусь (Мінск), Музеі сучаснага выяўленчага мастацтва (Мінск), Гродзенскім дзяржаўным гісторыка-археалагічным музеі, фондзе Беларускага саюза мастакоў (Мінск).

**Малкін Барыс Яўсеевіч** (1908, г. Прылукі, Чарнігаўская губ., Расійская імперыя, — 1972). Працаваў у сцэнаграфіі, кніжнай і станковай графіцы. Удзельнік мастацкіх выставак з 1929 г. Член Беларускага саюза мастакоў (1940). Творы захоўваюцца ў Нацыянальным мастацкім музеі Рэспублікі Беларусь (Мінск), фондзе Беларускага саюза мастакоў (Мінск).

**Марчанка Леанід Максімавіч** (1941, г. Бабруйск, Магілёўская вобл., Беларусь, — 1996). Узнагароджаны прэміямі і дыпломам Саюза мастакоў СССР за лепшую работу (1981, 1986, 1987, 1989). Працаваў у станковай графіцы і акварэлі. Удзельнік мастацкіх выставак з 1966 г. Член Беларускага саюза мастакоў (1974). Творы захоўваюцца ў Нацыянальным мастацкім музеі Рэспублікі Беларусь (Мінск), фондзе Беларускага саюза мастакоў (Мінск), Магілёўскім абласным мастацкім музеі імя П.В. Масленікава, Брэсцкім абласным краязнаўчым музеі, выставачным аб’яднанні «Цэнтральны дом мастака» (Масква, Расія), Дзяржаўнай Траццякоўскай галерэі (Масква, Расія), Магнітагорскай карціннай галерэі (Расія), Пензенскай абласной карціннай галерэі імя К.А. Савіцкага (Расія), Музеі Людвіга (Кёльн, Германія).

**Марачкін Аляксей Антонавіч** (1940, в. Новая Слабада, Магілёўская вобл., Беларусь). Працуе ў станковым жывапісе ў жанрах фігуратыўнай кампазіцыі і партрэта. Удзельнік мастацкіх выставак з 1966 г. Член Беларускага саюза мастакоў (1977). Творы захоўваюцца ў Нацыянальным мастацкім музеі Рэспублікі Беларусь (Мінск), Музеі сучаснага выяўленчага мастацтва (Мінск), Магілёўскім абласным мастацкім музеі імя П.В. Масленікава, Гродзенскім дзяржаўным музеі гісторыі рэлігіі, Музеі беларускай культуры ў г. Гайнаўка (Польшча), Беларускім музеі ў г. Ляман (Германія).

**Масленікаў Уладзімір Паўлавіч** (1956, г. Мінск, Беларусь). Узнагароджаны медалём Францыска Скарыны (2012). Працуе ў станковым жывапісе ў жанрах пейзажа і партрэта. Удзельнік мастацкіх выставак з 1980 г. Член Беларускага саюза мастакоў (1989). Творы захоўваюцца ў Нацыянальным мастацкім музеі Рэспублікі Беларусь (Мінск), Музеі сучаснага выяўленчага мастацтва (Мінск), Беларускім дзяржаўным музеі гісторыі Вялікай Айчыннай вайны (Мінск), Магілёўскім абласным мастацкім музеі імя П.В. Масленікава, Гомельскім абласным краязнаўчым музеі, фондзе Беларускага саюза мастакоў (Мінск), прыватных калекцыях Беларусі, Расіі, Германіі, Італіі, Англіі, ЗША, Ізраіля, Кітая, Чэхіі, Францыі.

**Мікіта Віктар Васільевіч** (1955, г. Гродна, Беларусь). Узнагароджаны дыпломамі рэспубліканскіх, міжнародных і ўсесаюзных конкурсаў кнігі. Працуе ў кніжнай і станковай графіцы. Удзельнік мастацкіх выставак з 1976 г. Член Беларускага саюза мастакоў (1981). Творы захоўваюцца ў Нацыянальным мастацкім музеі Рэспублікі Беларусь (Мінск), Музеі сучаснага выяўленчага мастацтва (Мінск), Дзяржаўным літаратурна-мемарыяльным доме-музеі Якуба Коласа (Мінск) і зборах іншых музеяў Беларусі, фондзе Беларускага саюза мастакоў (Мінск).

**Мінейка Уладзімір Андрэевіч** (1925, г. Растоў-на-Доне, Расія — 2001). Працаваў ва ўсіх жанрах станковага жывапісу. Удзельнік мастацкіх выставак з 1951 г. Член Беларускага саюза мастакоў (1956). Творы захоўваюцца ў Нацыянальным мастацкім музеі Рэспублікі Беларусь (Мінск), Музеі сучаснага выяўленчага мастацтва (Мінск), фондзе Беларускага саюза мастакоў (Мінск).

**Міронаў Міхаіл Іванавіч** (1952, г. Клімавічы, Магілёўская вобл., Беларусь, — 2009). Жывапісец, працаваў у тэхніцы акварэлі. Удзельнік мастацкіх выставак з 1977 г. Член Беларускага саюза мастакоў

(1985). Творы захоўваюцца ў Нацыянальным мастацкім музеі Рэспублікі Беларусь (Мінск), Нацыянальным Полацкім гісторыка-культурным музеі-запаведніку (Віцебская вобл.), Краснаярскім дзяржаўным мастацкім музеі імя В.І. Сурыкава (Расія), Карцінный галерэі Дзяржаўнага Карачаева-Чаркескага гісторыка-культурнага і прыроднага музея-запаведніка імя М.А. Байчоравай (Чаркеск, Расія).

**Міхельсон Віктар Васільевіч** (1926—?)

**Палякоў Мікалай Цярэнцьевіч** (1936, в. Рабяткі, Магілёўская вобл., Беларусь, — 2008). Узнагароджаны бронзавым медалём ВДНГ СССР. Працаваў у манументальнай і станковай скульптуры. Удзельнік мастацкіх выставак з 1959 г. Член Беларускага саюза мастакоў (1967). Творы захоўваюцца ў Нацыянальным мастацкім музеі Рэспублікі Беларусь (Мінск), фондзе Беларускага саюза мастакоў (Мінск).

**Паплаўскі Георгій Георгіевіч** (1931, г. Роўна, Кіравагградская вобл., Украіна, — 2017). Заслужаны дзеяч мастацтваў Беларусі (1977), народны мастак Беларусі (1997), акадэмік Расійскай акадэміі Мастацтваў (1991) і ганаровы акадэмік Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі (1995). Лаўрэат Дзяржаўнай прэміі Беларусі (2002), лаўрэат прэміі Саюзнай дзяржавы ў галіне літаратуры і мастацтва (2012). Узнагароджаны Міжнароднай прэміяй імя Дж. Нэру (1973), сярэбраным медалём АМ СССР (1984), залатымі медалямі Францыска Скарыны (1969, 1981, 1984, 1988), прэміяй Ленінскага камсамола Беларусі (1970). Працуе ў розных тэхніках станковай і кніжнай графікі, станковым жывапісе. Удзельнік мастацкіх выставак з 1954 г. Член Беларускага саюза мастакоў (1961). Творы захоўваюцца ў Нацыянальным мастацкім музеі Рэспублікі Беларусь (Мінск), фондзе Беларускага саюза мастакоў (Мінск), Дзяржаўным музейна-выставачным цэнтры Міністэрства культуры Расіі (Масква), выставачным аб'яднанні «Цэнтральны Дом мастака» (Масква, Расія), Дзяржаўным музеі выяўленчых мастацтваў імя А.С. Пушкіна (Масква, Расія), Дзяржаўным Рускім музеі (Санкт-Пецярбург, Расія), Музеі Смітсанаўскга інстытута ў Вашынгтоне (ЗША).

**Паўлаў Іван Мікалаевіч** (1872, в. Папоўка, Тульская губ., Расійская імперыя, — 1951). Народны мастак РСФСР (1943), лаўрэат Дзяржаўнай прэміі СССР (1943). Працаваў у тэхніцы станковай гравюры. Удзельнік шматлікіх выставак, у т.л. персанальных (1918—1947). Творы захоўваюцца ў Дзяржаўнай Траццякоўскай галерэі (Масква, Расія), Дзяржаўным музеі выяўленчых мастацтваў імя А.С. Пушкіна (Масква, Расія), Дзяржаўным Рускім музеі (Санкт-Пецярбург, Расія).

**Паўлоўскі Зянон Станіслававіч** (1917, в. Прылукі, Мінская губ., Беларусь, — 1977). Працаваў у станковым жывапісе ў жанрах партрэта і карціны, а таксама ў жанры сатырычнага малюнка. Удзельнік мастацкіх выставак з 1934 г. Член Беларускага саюза мастакоў (1946). Творы захоўваюцца ў Нацыянальным мастацкім музеі Рэспублікі Беларусь (Мінск), Беларускім дзяржаўным музеі гісторыі Вялікай Айчыннай вайны (Мінск), фондзе Беларускага саюза мастакоў (Мінск).

**Пашчасцеў Уладзімір Сцяпанавіч** (1944, г. Іжэўск, Расія). Працуе ў станковай і кніжнай графіцы, экслібрысе. Удзельнік мастацкіх выставак з 1967 г. Член Беларускага саюза мастакоў (1969). Творы захоўваюцца ў Нацыянальным мастацкім музеі Рэспублікі Беларусь (Мінск), Музеі сучаснага выяўленчага мастацтва (Мінск), фондзе Беларускага саюза мастакоў (Мінск), Дзяржаўным музейна-выставачным цэнтры Міністэрства культуры Расіі (Масква), выставачным аб'яднанні «Цэнтральны дом мастака» (Масква, Расія).

**Полазаў Дзмітрый Мікалаевіч** (1875, г. Рослаўль, Смаленская губ., Расійская імперыя, — 1953). Працаваў у станковым жывапісе ў жанрах партрэта, пейзажа, нацюрморта. Педагог. Вучыўся ў майстэрні пад кіраўніцтвам У.Я. Макоўскага. Удзельнік першай мастацкай выстаўкі ў Мінску (1925). Стварыў партрэты Я. Купалы, Я. Коласа, З. Бядулі і іншых беларускіх пісьменнікаў. З Я. Купалам мастака звязвала вялікае асабістае сяброўства.

**Пратасеня Іван Міхайлавіч** (1931, в. Знамя, Мінская вобл., Беларусь). Працуе ў акварэлі і кніжнай графіцы. Удзельнік мастацкіх выставак з 1964 г. Член Беларускага саюза мастакоў (1973). Творы захоўваюцца ў Нацыянальным мастацкім музеі Рэспублікі Беларусь (Мінск), Музеі сучаснага выяўленчага мастацтва (Мінск), фондзе Беларускага саюза мастакоў (Мінск), Мінскім абласным краязнаўчым музеі (Маладзечна), Магілёўскім і Брэсцкім абласных краязнаўчых музеях, Літаратурным музеі Максіма Багдановіча (Мінск), Дзяржаўным літаратурным музеі Петруся Броўкі (Мінск) і зборах іншых музеяў Беларусі, а таксама ў Мемарыяльным доме-музеі Максіма Багдановіча (Яраслаўль, Расія).

**Пучынскі Юзэф Вульфавіч** (1922, г. Узда, Мінская вобл., Беларусь, — 2007). Заслужаны работнік культуры (1992). Працаваў у станковай і кніжнай графіцы, жывапісе. Удзельнік мастацкіх выставак з 1946 г. Член саюза мастакоў БССР (1959).

**Рабашчук Станіслаў Мікалаевіч** (1952, с. Оснікі, Жытомірская вобл., Украіна). Працуе ў манументальна-дэкаратыўным і станковым жывапісе. Удзельнік мастацкіх выставак з 1977 г. Член Беларускага саюза мастакоў (1985). Творы захоўваюцца ў Музеі сучаснага выяўленчага мастацтва (Мінск), фондзе Беларускага саюза мастакоў (Мінск).

**Раберман Леў Е.** (1923)

**Раберман Марк Е.** (1921)

**Раманаў Сяргей Рыгоравіч** (1914, г. Масква, Расійская імперыя, — 2001). Заслужаны дзеяч мастацтваў Беларусі (1966). Узнагароджаны ордэнам Айчыннай вайны II ст. (1985). Працаваў у розных тэхніках станковай і кніжнай графікі, а таксама у жывапісе. Удзельнік мастацкіх выставак з 1945 г. Член Беларускага саюза мастакоў (1945). Афармляў кнігі беларускіх пісьменнікаў Я. Купалы, Я. Коласа, П. Броўкі, М. Танка, У. Карпава. Творы захоўваюцца ў Нацыянальным мастацкім музеі Рэспублікі Беларусь (Мінск), Музеі сучаснага выяўленчага мастацтва (Мінск), Беларускім дзяржаўным музеі гісторыі Вялікай Айчыннай вайны (Мінск), Дзяржаўным літаратурна-мемарыяльным доме-музеі Якуба Коласа (Мінск), фондзе Беларускага саюза мастакоў (Мінск) і зборах іншых музеяў Беларусі.



**Раманоўскі Іван Юльянавіч** (Янка Раманоўскі; 1928, г. Мінск, Беларусь — 1974). Працаваў у станковай і кніжнай графіцы, жывапісе. Удзельнік мастацкіх выставак з 1960 г. Член Беларускага саюза мастакоў (1962). Пляменнік Я. Купалы. Стварыў шэраг мастацкіх твораў, у т.л. партрэтаў, прысвечаных Я. Купалу, ілюстрацыі да твораў паэта. Творы захоўваюцца ў Нацыянальным мастацкім музеі Рэспублікі Беларусь (Мінск), Музеі сучаснага выяўленчага мастацтва (Мінск), Дзяржаўным літаратурна-мемарыяльным доме-музеі Якуба Коласа (Мінск), фондзе Беларускага саюза мастакоў (Мінск) і зборах іншых музеяў Беларусі.

**Ран Лазар Саулавіч** (1909, г. Дзвінск, Расійская імперыя, — 1989). Працаваў у станковай графіцы і жывапісе. Удзельнік мастацкіх выставак з 1934 г. Член Беларускага саюза мастакоў (1940). Творы захоўваюцца ў Нацыянальным мастацкім музеі Рэспублікі Беларусь (Мінск), Музеі сучаснага выяўленчага мастацтва (Мінск), Дзяржаўным літаратурна-мемарыяльным доме-музеі Якуба Коласа (Мінск), фондзе Беларускага саюза мастакоў (Мінск) і зборах іншых музеяў Беларусі.

**Рыбкін Аляксандр Васільевіч** (1929, г. Высакоўск, Маскоўская вобл., Расія). Скульптар. Удзельнік мастацкіх выставак з 1961 г. Член саюза мастакоў Расіі. Творы захоўваюцца ў мемарыяльным комплексе «Брэсцкая крэпасць-герой».

**Рыжыкаў Мікалай Максімавіч** (1939, г. Галубоўка, Луганская вобл., Украіна, — 2012). Працаваў у станковай графіцы і акварэльным жывапісе. Удзельнік мастацкіх выставак з 1966 г. Член Беларускага саюза мастакоў (1972). Творы захоўваюцца ў Нацыянальным мастацкім музеі Рэспублікі Беларусь (Мінск), Музеі сучаснага выяўленчага мастацтва (Мінск), Магілёўскім абласным мастацкім музеі імя П.В. Масленікава, Віцескім абласным краязнаўчым музеі, галерэі г. Клопенбург (Германія), Музеі архітэктуры і дызайна (Чыкага, ЗША).

**Рэй Іван Пятровіч** (1930, в. Падбулькава, Брэсцкая вобл., Беларусь, — 2002). Заслужаны дзеяч мастацтваў Беларусі (1988). Лаўрэат Спецыяльнай прэміі Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь у галіне літаратуры і мастацтва (2000). Узнагароджаны медалём Францыска Скарыны (2001). Працаваў у розных жанрах станковага жывапісу, а таксама ў манументальна-дэкаратыўным мастацтве. Удзельнік мастацкіх выставак з 1959 г. Член Беларускага саюза мастакоў (1964). Творы захоўваюцца ў Нацыянальным мастацкім музеі Рэспублікі Беларусь (Мінск), Музеі сучаснага выяўленчага мастацтва (Мінск), Магілёўскім абласным мастацкім музеі імя П.В. Масленікава, Віцебскім мастацкім музеі, Беларускім дзяржаўным музеі народнай архітэктуры і побыту (в. Азярцо, Мінская вобл.), Дзяржаўным літаратурна-мемарыяльным доме-музеі Якуба Коласа (Мінск), фондзе Беларускага саюза мастакоў (Мінск), Дзяржаўным музейна-выставачным цэнтры Міністэрства культуры Расіі (Масква).

**Савіцкі Міхаіл Андрэевіч** (1922, в. Звянячы, Віцебская вобл., Беларусь, — 2010). Заслужаны дзеяч мастацтваў Беларусі (1970), народны мастак Беларусі (1972) і СССР (1978). Лаўрэат Дзяржаўнай прэміі Беларусі (1970, 1980, 1996) і СССР (1973). Герой Беларусі (2006). Узнагароджаны ордэнам Айчыннай вайны II ст. (1967), Францыска Скарыны (1997), «Знак Пашаны» (1967). Працаваў у галіне станковага і манументальнага жывапісу. Удзельнік мастацкіх выставак з 1957 г. Член Беларускага саюза мастакоў (1958). Творы захоўваюцца ў Нацыянальным мастацкім музеі Рэспублікі Беларусь (Мінск), Музеі гісторыі г. Мінска, Беларускім дзяржаўным музеі гісторыі Вялікай Айчыннай вайны (Мінск), фондзе Беларускага саюза мастакоў (Мінск), Дзяржаўнай Траццякоўскай галерэі (Масква, Расія), Дзяржаўным музейна-выставачным цэнтры Міністэрства культуры Расіі (Масква).

**Савіч Уладзімір Пятровіч** (1952, в. Хатавічы, Мінская вобл., Беларусь). Заслужаны дзеяч мастацтваў Беларусі (1990). Лаўрэат Дзяржаўнай прэміі Беларусі (2009), лаўрэат прэміі прафсаюзаў Беларусі (1989). Узнагароджаны ордэнам Францыска Скарыны (2017), шматлікімі дыпломамі і прэміямі за лепшае афармленне кніг. Працуе ў станковай і кніжнай графіцы. Удзельнік мастацкіх выставак з 1972 года. Член Беларускага саюза мастакоў (1978). Творы захоўваюцца ў Нацыянальным мастацкім музеі Рэспублікі Беларусь (Мінск), Музеі сучаснага выяўленчага мастацтва (Мінск), фондзе Беларускага саюза мастакоў (Мінск), Дзяржаўным музейна-выставачным цэнтры Міністэрства культуры Расіі (Масква), Дзяржаўнай Траццякоўскай галерэі (Масква, Расія), галерэі «Vil-impex-oy» (Хельсінкі, Фінляндыя), галерэі графікі г. Банска-Быстрыца (Славакія), прыватных калекцыях Беларусі і замежжа.

**Сарока Дзмітрый Уладзіміравіч** (1944, в. Крапіўнікі, Мінская вобл., Беларусь). Працуе ў розных жанрах станковага жывапісу. Удзельнік мастацкіх выставак з 1972 г. Член Беларускага саюза мастакоў (1994). Творы захоўваюцца ў Музеі сучаснага выяўленчага мастацтва (Мінск).

**Селяшчук Мікалай Мікалаевіч** (1947, в. Велікарыта, Брэсцкая вобл., Беларусь, — 1996). Лаўрэат Дзяржаўнай прэміі Беларусі (1992). Уганараваны дыпломамі і прэміямі рэспубліканскіх і ўсесаюзных конкурсаў кнігі, залатым медалём і дыпломам біенале кніжнай ілюстрацыі ў Браціславе (1989, Славакія). Працаваў у станковай і кніжнай графіцы, розных жанрах станковага жывапісу. Удзельнік мастацкіх выставак з 1966 г. Член Беларускага саюза мастакоў (1977). Творы захоўваюцца ў Нацыянальным мастацкім музеі Рэспублікі Беларусь (Мінск), фондзе Беларускага саюза мастакоў (Мінск), Дзяржаўнай Траццякоўскай галерэі (Масква, Расія), Музеі сучаснага мастацтва Экватарыяльнай Гвінеі (Малабо), музеі «Мальбарк» (Польшча), «Шлесбурк» (Германія), галерэях «Кастані» (Грэцыя), «Хагестам» (Фінляндыя), бібліятэцы Кірыла і Мяфодзія (Балгарыя), а таксама ў ЗША і прыватных калекцыях.

**Сергіевіч Пётр Аляксандравіч** (Пётра Сергіевіч; 1900, в. Стаўрова, Віленская губ., Расійская імперыя, — 1984). Заслужаны дзеяч мастацтваў Літоўскай ССР (1960). Жывапісец, графік, мастак-манументаліст. Першая персанальная выстаўка адбылася ў Вільні ў 1935—1936 гг. У жывапісе шырока выкарыстоўваў матывы творчасці Я. Купалы. Паводле прызнання мастака, паэзія Я. Купалы, у прыватнасці зборнік «Шляхам жыцця», значна паўплывала на фарміраванне яго духоўнага і творчага свету. Аўтар галерэі

вобразаў беларусаў, стваральнік партрэтаў беларускіх дзеячаў культуры і літаратуры, а таксама сюжэтна-тэматычных і гістарычных палотнаў. Творы захоўваюцца ў дзяржаўных зборах музеяў Беларусі, Літвы, ЗША, Германіі, Польшчы, Расіі, а таксама ў прыватных зборах.

**Сітніца Рыгор Сямёнавіч** (1958, в. Курыцічы, Гомельская вобл., Беларусь). Ганаровы акадэмік Расійскай акадэміі мастацтваў (2015). Лаўрэат Нацыянальнай прэміі Беларусі ў галіне выяўленчага мастацтва (2017), лаўрэат літаратурнай прэміі «Залаты апостраф». Узнагароджаны медалём Францыска Скарыны (2012). Працуе ў станковай графіцы. Паэт. Удзельнік мастацкіх выставак з 1980 г. Член Беларускага саюза мастакоў (1985). Творы захоўваюцца ў Нацыянальным мастацкім музеі Рэспублікі Беларусь (Мінск), Музеі сучаснага выяўленчага мастацтва (Мінск), Літаратурным музеі Максіма Багдановіча (Мінск), фондзе Беларускага саюза мастакоў (Мінск), Музеі беларускай культуры ў г. Гайнаўка (Польшча).

**Стасевіч Іван Нічыпаравіч** (1929, в. Мядзведня, Мінская вобл., Беларусь, — 1998). Заслужаны дзеяч мастацтваў Беларусі (1980), прафесар (1985). Жывапісец. Удзельнік мастацкіх выставак з 1958 г. Член Беларускага саюза мастакоў (1960). Творы захоўваюцца ў Нацыянальным мастацкім музеі Рэспублікі Беларусь (Мінск), Беларускім дзяржаўным музеі гісторыі Вялікай Айчыннай вайны (Мінск), Музеі сучаснага выяўленчага мастацтва (Мінск), музеях Віцебскай і Гомельскай абласцей, у карцінных галерэях г. Кемерава і г. Іркуцка (Расія), Дзяржаўным музейна-выставачным цэнтры Міністэрства культуры Расіі (Масква).

**Сташчанюк Віктар Пятровіч** (1933, в. Сёгда, Гродзенская вобл., Польшча, — 2007). Працаваў у кніжнай і станковай графіцы, а таксама ў дэкаратыўна-прыкладным мастацтве (кераміка). Удзельнік мастацкіх выставак з 1976 г. Член Беларускага саюза мастакоў (1993). Творы захоўваюцца ў Нацыянальным мастацкім музеі Рэспублікі Беларусь (Мінск), Музеі сучаснага выяўленчага мастацтва (Мінск), Літаратурным музеі Максіма Багдановіча (Мінск), школьным музеі В. Дуніна-Марцінкевіча (в. Пяршаі, Гродзенскай вобл.), музеі-сядзібе Францішка Багушэвіча «Кушляны» (Гродзенскай вобл.), Гісторыка-культурным музеі-запаведніку «Заслаўе» (Мінская вобл.), Навагрудскім гісторыка-краязнаўчым музеі (Гродзенская вобл.).

**Сулкоўскі Уладзімір Якаўлевіч** (1950, г. Брэст, Беларусь, — 2013). Працаваў у станковым жывапісе ў жанрах тэматычнай карціны, пейзажа, нацюрморта. Удзельнік мастацкіх выставак з 1972 г. Член Беларускага саюза мастакоў (1981). Творы захоўваюцца ў Нацыянальным мастацкім музеі Рэспублікі Беларусь (Мінск), фондзе Беларускага саюза мастакоў (Мінск), Дзяржаўным музейна-выставачным цэнтры Міністэрства культуры Расіі (Масква), Музеі беларускай культуры ў г. Гайнаўка (Польшча).

**Сургайліс Леапольдас Лаўрынавіч** (1928)

**Табушаў Уладзімір Пятровіч** (1929, г. Бабруйск, Магілёўская вобл., Беларусь, — 1993). Працаваў у тэхніцы акварэлі і алоўка, а таксама ў кніжнай і часопіснай графіцы. Удзельнік мастацкіх выставак з 1966 года. Член Беларускага саюза мастакоў (1990).

**Таранда Мікалай Іванавіч** (1947, в. Вялікае Падлессе, Брэсцкая вобл., Беларусь). Працуе ў станковым жывапісе і графіцы, пераважна ў жанрах пейзажа і нацюрморта. Удзельнік мастацкіх выставак з 1973 года. Член Беларускага саюза мастакоў (1990).

**Тоўсцік Уладзімір Антонавіч** (1949, г. Мінск, Беларусь). Заслужаны дзеяч мастацтваў Беларусі (1990), народны мастак Беларусі (2010). Лаўрэат Дзяржаўнай прэміі Беларусі (1994), лаўрэат Нацыянальнай прэміі Беларусі ў галіне выяўленчага мастацтва (2017). Працуе ў розных жанрах станковага жывапісу. Удзельнік мастацкіх выставак з 1972 г. Член Беларускага саюза мастакоў (1978). Творы захоўваюцца ў Нацыянальным мастацкім музеі Рэспублікі Беларусь (Мінск), Музеі сучаснага выяўленчага мастацтва (Мінск), фондзе Беларускага саюза мастакоў (Мінск), Дзяржаўным музейна-выставачным цэнтры Міністэрства культуры Расіі (Масква), Бакінскім мастацкім музеі імя Мустафаева (Азербайджан), галерэі «П. Брэйгель» (Амстэрдам, Галандыя), музеі «Zimmerli Art» (ЗША), галерэі «Марка Датрына» (Італія), у прыватных зборах Беларусі, Германіі, Польшчы, Фінляндыі, Швейцарыі, Грэцыі, Славеніі, Ізраіля, Галандыі, ЗША, Расіі.

**Тычына Анатоль Мікалаевіч** (1897, в. Груздзжай, Ковенская губ., Расійская імперыя, — 1986). Працаваў у розных тэхніках станковай і кніжнай графікі, у экслібрысе, станковым жывапісе. Удзельнік Першай Усебеларускай выстаўкі выяўленчага мастацтва (1925). Член Беларускага саюза мастакоў (1940). Быў асабіста знаёмы з Я. Купалам. Неаднаразова наведваў дом паэта на Садова-Набярэжнай у Мінску. У маі 1933 г. адбылася іх сумесная паездка на Любаншчыну, у выніку якой з'явіўся цыкл графічных твораў, прысвечаных асушэнню балот. Сюжэты мастак абмяркоўваў з Я. Купалам. Запамінальнай была іх сустрэча ў 1939 г. у Беластоку. Творы захоўваюцца ў Нацыянальным мастацкім музеі Рэспублікі Беларусь (Мінск), Дзяржаўным музеі гісторыі беларускай літаратуры (Мінск), фондзе Беларускага саюза мастакоў (Мінск), Шаўляйскім музеі «Аўшрос» (Літва).

**Уродніч Уладзімір Васільевіч** (1942, в. Вялікія Арлы, Брэсцкая вобл., Беларусь). Заслужаны дзеяч мастацтваў Беларусі (1992). Працуе ў розных жанрах станковага жывапісу. Удзельнік мастацкіх выставак з 1973 г. Член Беларускага саюза мастакоў (1974). Творы захоўваюцца ў Нацыянальным мастацкім музеі Рэспублікі Беларусь (Мінск), Беларускім дзяржаўным музеі гісторыі Вялікай Айчыннай вайны (Мінск), Музеі сучаснага выяўленчага мастацтва (Мінск), фондзе Беларускага саюза мастакоў (Мінск), Літаратурным музеі Максіма Багдановіча (Мінск), Дзяржаўным літаратурна-мемарыяльным доме-музеі Якуба Коласа (Мінск), Дзяржаўным музеі гісторыі беларускай літаратуры (Мінск) і зборах іншых музеяў Беларусі.

**Хараберуш Алена Аляксееўна** (няма звестак)

**Харанека Уладзімір Сямёнавіч** (1942, в. Дворышча, Гомельская вобл., Беларусь — ?). Скончыў Беларускі тэатральна-мастацкі інстытут, аддзяленне мастацкай апрацоўкі дрэва (1970). Стажыраваўся па рэстаўрацыі алейнага і тэмпернага жывапісу ва Усерасійскім мастацкім навукова-рэстаўрацыйным цэнтры імя І.Э. Грабара (Масква), Дзяржаўным Рускім музеі (Санкт-Пецярбург, Расія).



**Харашэвіч Кастусь Іванавіч** (1927, в. Літва, Мінская вобл., Беларусь, — 2013). Жывапісец. Персанальныя выстаўкі адбыліся ў 1977, 2003, 2010 гг. Член Беларускага саюза мастакоў (1969). Творы захоўваюцца ў Нацыянальным мастацкім музеі Рэспублікі Беларусь (Мінск), Музеі сучаснага выяўленчага мастацтва (Мінск), фондзе Беларускага саюза мастакоў (Мінск), Мінскім абласным краязнаўчым музеі (Маладзечна) і зборах іншых музеяў Беларусі, Беларускай бібліятэцы імя Францыска Скарыны ў Лондане, а таксама ў прыватных зборах Польшчы, Германіі, ЗША, Канады, Ізраіля.

**Хісамаў Айдар Нурмухамедавіч** (1962, г. Казань, Расія). Заслужаны дзеяч мастацтваў Рэспублікі Татарстан. Член Саюза мастакоў Татарстана (1997) і Саюза мастакоў Расіі (2003). Персанальныя выстаўкі адбыліся ў Маскве (1996), Францыі (2002), Турцыі (2002), Германіі, (2002, 2003), Нідэрландах (2003, 2004), Аўстрыі (2002, 2003). Творы захоўваюцца ў Музеі выяўленчага мастацтва (Казань, Расія), Нацыянальнай галерэі ў Крамлі (Казань, Расія), а таксама ў прыватных зборах ЗША, Японіі, Ізраіля, ААЭ, Францыі, Расіі, Іспаніі, Кітая, Канады, Перу.

**Целеш Вячаслаў Міхайлавіч** (1938, п. Краснасельскі, Гарадзенскае ваяводства, Польшча). Узнагароджаны Ордэнам Трох Зорак — вышэйшай узнагародай Латвіі (2006). Працуе ў розных жанрах станковага жывапісу і графікі, а таксама ў экслібрысе. Удзельнік мастацкіх выставак з 1975 г. Аўтар партрэтаў беларускіх дзеячаў культуры і літаратуры Ф. Скарыны, В. Дуніна-Марцінкевіча, М. Багдановіча, а таксама шэрагу экслібрысаў беларускіх пісьменнікаў: У. Караткевіча, С. Панізніка, А. Мальдзіса, З. Верас. Творы захоўваюцца ў музеях і прыватных зборах Беларусі, Даніі, ЗША, Ізраіля, Канады, Кітая, Расіі, Румыніі, Францыі, Чэхіі, Швейцарыі.

**Ціхановіч Валянцін Мікалаевіч** (1909, г. Вільня, Расійская імперыя, — 1978). Працаваў у кніжнай і станковай графіцы, сатырычным малюнку і экслібрысе. Удзельнік мастацкіх выставак з 1934 г. Член Беларускага саюза мастакоў (1945). Ілюстраваў кнігі беларускіх пісьменнікаў: В. Віткі, А. Гурло, З. Бядулі, А. Вялюгіна, М. Танка. Творы захоўваюцца ў Нацыянальным мастацкім музеі Рэспублікі Беларусь (Мінск), фондзе Беларускага саюза мастакоў (Мінск).

**Ціхановіч Яўген Мікалаевіч** (1911, г.п. Джусалы, Казахстан, — 2005). Працаваў у станковым жывапісе, кніжнай і станковай графіцы, экслібрысе. Удзельнік мастацкіх выставак з 1932 г. Член Беларускага саюза мастакоў (1933). Творы захоўваюцца ў Нацыянальным мастацкім музеі Рэспублікі Беларусь (Мінск), Музеі сучаснага выяўленчага мастацтва (Мінск), Літаратурным музеі Максіма Багдановіча (Мінск), Літаратурна-мемарыяльным музеі Якуба Коласа (Мінск), Беларускім дзяржаўным музеі гісторыі Вялікай Айчыннай вайны (Мінск), Магілёўскім абласным мастацкім музеі імя П.В. Масленікава, Віцебскім краязнаўчым музеі, фондзе Беларускага саюза мастакоў (Мінск).

**Шаранговіч Васіль Пятровіч** (1939, в. Качаны, Мінская вобл., Беларусь). Заслужаны дзеяч мастацтваў Беларусі (1978), заслужаны дзеяч культуры Польшчы (1986), народны мастак Беларусі (1991). Лаўрэат Дзяржаўнай прэміі Беларусі (1986). Працуе ў кніжнай і станковай графіцы. Удзельнік мастацкіх выставак з 1967 г. Член Беларускага саюза мастакоў (1970). Творы захоўваюцца ў Нацыянальным мастацкім музеі Рэспублікі Беларусь (Мінск), Музеі сучаснага выяўленчага мастацтва (Мінск), Літаратурна-мемарыяльным музеі Якуба Коласа (Мінск), Магілёўскім абласным мастацкім музеі імя П.В. Масленікава, фондзе Беларускага саюза мастакоў (Мінск), Дзяржаўным музейна-выставачным цэнтры Міністэрства культуры Расіі (Масква).

**Шастоўскі Кім Фёдаравіч** (1935, в. Ляўкі, Віцебская вобл., Беларусь, — 2016). Працаваў у розных жанрах станковага жывапісу і графікі. Удзельнік мастацкіх выставак з 1957 г. Член Беларускага саюза мастакоў (1979). Творы захоўваюцца ў Нацыянальным мастацкім музеі Рэспублікі Беларусь (Мінск), Музеі сучаснага выяўленчага мастацтва (Мінск), фондзе Беларускага саюза мастакоў (Мінск).

**Шаўчэнка Акім Міхайлавіч** (1902, в. Карма, Магілёўская губ., Расійская імперыя, — 1980). Працаваў у розных жанрах станковага жывапісу. Удзельнік мастацкіх выставак з 1929 г. Член Беларускага саюза мастакоў (1940). Творы захоўваюцца ў Нацыянальным мастацкім музеі Рэспублікі Беларусь (Мінск), фондзе Беларускага саюза мастакоў (Мінск).

**Шаціла Алесь Пятровіч** (1978, г. Мінск, Беларусь). Скульптар. Удзельнік мастацкіх выставак з 1997 г. Член Беларускага саюза мастакоў (2007). Творы захоўваюцца ў Нацыянальным мастацкім музеі Рэспублікі Беларусь (Мінск), Палацы Незалежнасці (Мінск), Нацыянальным Палацава-паркавым музеі-запаведніку «Нясвіж» (Мінская вобл.), Гісторыка-культурным музеі-запаведніку «Заслаўе» (Мінская вобл.), Дзяржаўным літаратурна-мемарыяльным доме-музеі Якуба Коласа (Мінск), прыватных калекцыях.

**Янушкевіч Валяр'ян Іосіфавіч** (1962, г. Ракаў, Мінская вобл., Беларусь). Лаўрэат прэміі Федэрацыі прафсаюзаў Беларусі (2005). Працуе ў манументальнай і станковай скульптуры. Удзельнік мастацкіх выставак з 1982 г. Член Беларускага саюза мастакоў (1988). Творы захоўваюцца ў Нацыянальным мастацкім музеі Рэспублікі Беларусь (Мінск), Дзяржаўным музеі гісторыі беларускай літаратуры (Мінск), фондзе Беларускага саюза мастакоў (Мінск). Аўтар помнікаў А. Міцкевічу ў г. Лідзе і г. Навагрудку (Гродзенская вобл.), І. Гашкевічу ў г. Астравец (Гродзенская вобл.), мемарыяльных дошак Ф. Скарыну ў г. Кракаве (Польшча), г. Падуі (Італія) і г. Мінску, М.К. Агінскаму ў г. Фларэнцыя (Італія).

## Спіс выданняў, аформленых і ілюстраваных мастакамі

**Александровіч Анатоль Вячаслававіч**

Янка Купала. Выйдзі з сэрцам, як з паходняй… Выбранае. Мінск: Юнацтва, 1982. Ілюстрацыі.

**Александровіч Віктар Францавіч**

Янка Купала. Вершы. Мінск: Мастацкая літаратура, 1982. Ілюстрацыі.

**Басалыга Міхаіл Самуілавіч**

Янка Купала. Вершы і паэмы. Мінск: Мастацкая літаратура, 1982. Вокладка, ілюстрацыі.

Янка Купала. Курган. Мінск: Юнацтва, 1987. Вокладка, ілюстрацыі.

**Басалыга Уладзімір Самуілавіч**

Янка Купала. Алеся. Хлопчык і лётчык. Мінск: Беларусь, 1970. Ілюстрацыі.

**Бельскі Міхаіл Лявонцьевіч**

Янка Купала. Вершы. Паэмы. Мінск: Дзяржаўнае выдавецтва БССР, рэдакцыя мастацкай літаратуры, 1958. Ілюстрацыя.

Янка Купала. Паэмы. Мінск: Дзяржаўнае выдавецтва БССР, рэдакцыя дзіцячай і юнацкай літаратуры, 1957. Ілюстрацыі.

**Забораў Барыс Абрамавіч**

Янка Купала. Вершы. Мінск: Мастацкая літаратура, 1972. Вокладка, ілюстрацыі.

Янка Купала. Выбраная лірыка. Мінск: Беларусь, 1967. Ілюстрацыі.

**Зайцаў Юрый Канстанцінавіч**

Янка Купала. Избранное. Минск: Мастацкая літаратура, 1981. Ілюстрацыі.

**Кашкурэвіч Арлен Міхайлавіч**

Янка Купала. Курган. Паэма. Мінск: Беларусь, 1967. Ілюстрацыі.

Янка Купала. Стихотворения и поэмы. Павлинка. Якуб Колас. Стихотворения и поэмы. Москва: Художественная литература, 1969 (Библиотека всемирной литературы. Литература XX века; т. 156). Супервокладка, ілюстрацыі.

Янка Купала. Три поэмы. Минск: Беларусь, 1966. Ілюстрацыі.

Янка Купала. Тры паэмы. Мінск: Беларусь, 1972. Ілюстрацыі.

**Купава Мікалай Мікалаевіч**

Янка Купала. Лірыка. Мінск: Юнацтва, 1981. Вокладка, франтыспіс.

Лось Алена Георгіеўна

Слова пра паход Ігаравы. Пераклады Дзмітрыя Ліхачова, Мікалая Забалоцкага, Максіма Рыльскага, Янкі Купалы, Рыгора Барадуліна. Мінск: Мастацкая літаратура, 1986. Ілюстрацыі.

**Паплаўскі Георгій Георгіевіч**

Слова аб палку Ігаравым. Пераклад на беларускую мову Янкі Купалы. Мінск: Юнацтва, 1984. Супервокладка, франтыспіс, ілюстрацыі.

Янка Купала. Яна і Я. Паэма. Мінск: Мастацкая літаратура, 1979. Ілюстрацыі (дыплом першай ступені на Усесаюзным конкурсе мастацтва кнігі, 1980).

Янка Купала. Яна і Я. Паэма. Мінск: Мастацкая літаратура, 1985. Вокладка, ілюстрацыі (дыплом першай ступені XII Міжрэспубліканскага конкурса мастацтва кнігі Беларускай ССР, Літоўскай ССР, Латвійскай ССР? Эстонскай ССР. Талін, 1980).

Janka Kupala. Ona i ja. Minsk: Junactwa, 1985. Ілюстрацыі.

**Савіцкі Міхаіл Андрэевіч**

Янка Купала. А хто там ідзе? На мовах свету. Мінск: Мастацкая літаратура, 1983. Ілюстрацыі.

**Селяшчук Мікалай Мікалаевіч**

Алег Лойка. Як агонь, як вада...: раман-эсэ пра Янку Купалу. Мінск: Мастацкая літаратура, 1984. Ілюстрацыі.

**Сулкоўскі Уладзімір Якаўлевіч**

Андрэй Міраславіч. Янка Купала. Апавяданне ў малюнках. Мінск: Мастацкая літаратура, 2007. Ілюстрацыі.

**Шаранговіч Васіль Пятровіч**

Янка Купала. Адвечная песня. Драматычная паэма. Мінск: Юнацтва, 1981. Ілюстрацыі (дыплом II ступені на Усесаюзным конкурсе мастацтва кнігі).

Янка Купала. Паэмы. Драматычныя творы. Мінск: Мастацкая літаратура, 1989. Ілюстрацыі.

Янка Купала. Паэмы. Мінск: Мастацкая літаратура, 1978. Супервокладка, ілюстрацыі (дыплом імя Францыска (Георгія) Скарыны; дыплом II ступені на Усесаюзным конкурсе мастацтва кнігі).

## Бібліяграфія


1. Беларуская кніжная графіка / склад. М.І. Ганчароў. — Мінск : Беларусь, 1987. — С. 5—11.

2. Беларускі саюз мастакоў : 1938—1998 : энцыкл. даведнік / аўт.-склад. Б.А. Крэпак [і інш.]. — Мінск : Кавалер Паблішэрс, 1998.

3. Библиотека всемирной литературы : в 200 т. — М. : Художественная литература, 1967—1977. — Т. 156 : Янка Купала. Стихотворения и поэмы. Павлинка. Якуб Колас. Стихотворения и поэмы. — 1969. — (Серия третья «Литература XX века»).

4. Віншавальная тэлеграма ад Азгура З.І. да Луцэвіч У.Ф. 26.12.1951.

5. Дробаў, Л.Н. Сучасны беларускі партрэт. Жывапіс. Скульптура. Графіка / Л.Н. Дробаў. — Мінск : Беларусь, 1982.

6. Крэпак, Б.А. Акрылены штрых. Мастацкі летапіс рэспублікі / Б.А. Крэпак. —Мінск : Бібліятэка газеты «Голас Радзімы», 1974. — С. 49—58.

7. Купала і Колас, вы нас гадавалі : зборнік дакументаў і матэрыялаў : у 2 кн. / Дэпартамент па архівах і справаводстве Міністэрства юстыцыі Рэспублікі Беларусь, Нацыянальны архіў Рэспублікі Беларусь, Федэральнае архіўнае агенцтва Расіі, Расійскі дзяржаўны архіў літаратуры і мастацтва ; уклад. : В.Д. Селяменеў, В.У. Скалабан; рэдкал. : М.І. Мушынскі (гал. рэд.) [і інш.]. — Мінск : Літаратура і мастацтва, 2011. — Кн. 2 : 1939—2009. — С. 199, 208—209, 213—215.

8. Купала, Я. Адвечная песня : драматычная паэма / Я. Купала. — Мінск : Мастацкая літаратура, 1981.

9. Купала, Я. А хто там ідзе? На мовах свету / Я. Купала. — Мінск : Мастацкая літаратура, 1983.

10. Купала, Я. Вершы і паэмы / Я. Купала. — Мінск : Дзяржаўнае выдавецтва БССР, рэдакцыя мастацкай літаратуры, 1958.

11. Купала, Я. Вершы і паэмы / Я. Купала. — Мінск : Мастацкая літаратура, 1982.

12. Купала, Я. Вершы / Я. Купала. — Мінск : Мастацкая літаратура, 1972.

13. Купала, Я. Вершы / Я. Купала. — Мінск : Мастацкая літаратура, 1982.

14. Купала, Я. Выйдзі з сэрцам, як з паходняй!.. Выбранае / Я. Купала. — Мінск : Юнацтва, 1982.

15. Купала, Я. Жыве Беларусь : вершы, артыкулы / Я. Купала. — Мінск : Мастацкая літаратура, 1993.

16. Купала, Я. Збор твораў : у 7 т. / Я. Купала. — Мінск : Навука і тэхніка, 1972—1976.

17. Купала, Я. Избранное / Я. Купала. — Мінск : Мастацкая літаратура, 1981.

18. Купала, Я. Курган : паэма / Я. Купала. — Мінск : Беларусь, 1967.

19. Купала, Я. Курган : паэма / Я. Купала. — Мінск : Юнацтва, 1987.

20. Купала, Я. Лірыка / Я. Купала. — Мінск : Юнацтва, 1981.

21. Купала, Я. Паэмы. Драматычныя творы / Я. Купала. — Мінск : Мастацкая літаратура, 1989.

22. Купала, Я. Паэмы / Я. Купала. — Мінск : Дзяржаўнае выдавецтва БССР, рэдакцыя дзіцячай і юнацкай літаратуры, 1957.

23. Купала, Я. Паэмы / Я. Купала. — Мінск : Мастацкая літаратура, 1978.

24. Купала, Я. Поўны збор твораў : у 9 т. / Я. Купала. — Мінск : Мастацкая літаратура, 1995—2003.

25. Купала, Я. Три поэмы / Я. Купала. — Мінск : Беларусь, 1966.

26. Купала, Я. Тры паэмы / Я. Купала. — Мінск : Беларусь, 1972.

27. Купала, Я. Яна і Я : паэма / Я. Купала. — Мінск : Мастацкая літаратура, 1979.

54. Слова аб палку Ігаравым / пер. на бел. мову Я. Купалы. — Мінск : Юнацтва, 1984.

55. Слова пра паход Ігаравы / пер. : Д. Ліхачова [і інш.] ; склад. В.А. Чамярыцкі. — Мінск : Мастацкая літаратура, 1986.

56. Церашчатава, В.В. Беларуская кніжная графіка. 1917—1941 / В.В. Церашчатава. — Мінск : Навука і тэхніка, 1978.

57. Янка Купала ў выяўленчым мастацтве 1882—2002. Каталог твораў выяўленчага мастацтва Дзяржаўнага літаратурнага музея Янкі Купалы / Міністэрства культуры Рэспублікі Беларусь, Дзяржаўны літаратурны музей Янкі Купалы, Міжнародны фонд Янкі Купалы ; уклад.: Ф. Ваданосава, М. Чабатарэвіч, Г. Кушаль; [рэдкал.: Ж. Дапкюнас (гал. рэд.) і інш.]. — Мінск : Беларускі кнігазбор, 2003.

58. Янка Купала ў творчасці мастакоў = Янка Купала в творчестве художников: жывапіс, графіка, скульптура : альбом / аўт.-склад. Ю.А. Карачун. — Мінск : Беларусь, 1982.

Навукова-папулярнае выданне

**ЯНКА КУПАЛА**

Я адплаціў народу, чым моц мая магла...

У к л а д а л ь н і к і
**Ціханавецкая** В А
**Ляшковіч** А Р
**Саевіч** Н В

Рэдактар *А.А. Галкоўская*
Мастацкае афармленне *А.І. Бужынскай*
Мастацкія рэдактары *А.І. Бужынская, В.Г. Загародні*
Тэхнічны рэдактар *Ж.М. Бароўская*
Карэктар *В.І. Смірнова*

16+ Падпісана да друку 00.04.2019. Фармат $84 \times 108^{1}/_{16}$ .
Папера мелаваная. Друк афсетны.
Ум. друк. арк. 38,64. Ул.-выд. арк. 00,0. Тыраж 000 экз. Заказ

Рэспубліканскае ўнітарнае прадпрыемства «Выдавецтва «Беларусь».
Пасведчанне аб дзяржаўнай рэгістрацыі выдаўца, вытворцы,
распаўсюджвальніка друкаваных выданняў № 1/4 ад 09.07.2013.
Пр. Пераможцаў, 11, 220004, Мінск, Рэспубліка Беларусь.
http://belarusbook.by

Адкрытае акцыянернае таварыства
«Паліграфкамбінат імя Я. Коласа».
Пасведчанне аб дзяржаўнай рэгістрацыі выдаўца, вытворцы,
распаўсюджвальніка друкаваных выданняў № 2/38 ад 04.10.2013.
Вул. Каржанеўскага, 20, 222024, Мінск, Рэспубліка Беларусь.